Н43

БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 14 лістапада 2008 года, № 17-18 (1989-1990)

ПАДЗЕЯ

## БДУ ЎЗНАЧАЛІЎ СЯРГЕЙ АБЛАМЕЙКА

**Указам прэзідэнта краіны рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта прызначаны член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар Сяргей АБЛАМЕЙКА**



*Злева направа: Васіль Стражаў, Аляксандр Радзькоў, Сяргей Абламейка*

Міністр адукацыі рэспублікі Аляксандр Радзькоў 31 кастрычніка прадставіў Сяргея Абламейку калектыву БДУ. Сяргей Уладзіміравіч – выпускнік Белдзяржуніверсітэта, вядомы вучоны і да апошняга часу ўзначальваў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі. Кіраўнік Мінадукацыі акрэсліў задачы, якія стаяць перад новым рэктарам БДУ, галоўная з якіх – наладзіць больш трывалую сувязь навукі і адукацыі, надаць больш дынамізму і эфектыўнасці дзейнасці БДУ, каб павялічылася практычная аддача ад навуковых і адукацыйных праектаў Белдзяржуніверсітэта.

Аляксандр Радзькоў шчыра падзякаваў Васілю Стражаву за плённую працу і выказаў спадзяванне, што Васіль Іванавіч свой вопыт і веды будзе і далей прыкладаць на карысць БДУ і айчыннай адукацыі. Васіль Стражаў запэўніў у сваёй адданасці alma mater, якой збіраецца служыць у якасці прафесара і дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.



*Заслужаная пашана Васілю Стражаву ад міністра адукацыі*

### ДАВЕДКА

*Сяргей Абламейка нарадзіўся 24 верасня 1956 г. у п. Воранава Гродненскай вобл.*

У 1978 г. скончыў БДУ па спецыяльнасці "матэматыка". З 1978 г. па кастрычнік 2008 г. працаваў у Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі НАН Беларусі (з 2002 г. – дырэктар АІПІ). У 1984 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1990 г. – доктарскую. У 1992 г. яму прысвоена званне прафесара. У 2004 г. абраны чл.-кар. НАН Беларусі. Тады ж Указам прэзідэнта краіны прызначаны членам Прэзідыума НАН. На працягу шэрага гадоў працуе прафесарам кафедры матэматычнага забеспячэння АСУ факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ (па сумяшчальніцтве).

Сяргей Уладзіміравіч з'яўляецца вядомым вучоным у галіне інфарматыкі, апрацоўкі выяў і распазнавання вобразаў. Пад яго кіраўніцтвам і пры яго непасрэдным удзеле распрацаваны тэорыя, метады і алгарытмы апрацоўкі і распазнавання графічнай інфармацыі. Фундаментальныя вынікі ў дадзенай галіне атрымалі шырокую вядомасць. У гэтым напрамку сфарміравалася моцная навуковая школа, прызнаная за мяжой. С. Абламейка ўнёс значны ўклад у развіццё інфарматыкі ў Беларусі.

Сяргей Уладзіміравіч – аўтар 350 навуковых прац, палова з якіх перакладзеная на англійскую мову і апублікаваная ў вядучых навуковых выданнях свету.

У 1998 г. за вялікі ўклад у развіццё тэорыі апрацоўкі выяў С. Абламейка стаў першым віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі "За распазнаванні вобразаў (IAPR). Акрамя таго, ён абраны галоўным членам (Fellow) Брытанскага інстытута інжынераў па электратэхніцы (IEE), старшым членам (Senior Member) Амерыканскага інстытута інжынераў па электратэхніцы і электроніцы (IEEE), інжынерам па Хартыі (Chartered Engineer) Інжынерным Саветам Еўропы.

С. Абламейка з'яўляецца навуковым кіраўніком і старшынёй навукова-тэхнічнага савета шэрага дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў: ДКПНД "Навуковыя асновы інфармацыйных тэхналогій і сістэм", ДНТП "Інфармацыйныя тэхналогіі", Расійска-беларускіх праграм "Космас" і "СКІФ-ГРІД", намеснікам старшыні каардынацыйнага савета па ДКМНТП "Інфармацыйныя тэхналогіі". Быў кіраўніком міжнародных праектаў па праграмах КАПЕРНІКУС, ІНТАС, МНТЦ, 6-ай рамачнай праграмы ЕС, дамоў з прадпрыемствамі Беларусі, Расіі, Індыі.

Сяргей Абламейка з'яўляецца намеснікам старшыні Нацыянальнага савета па космасе Рэспублікі Беларусь, членам Камісіі па пытаннях дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі пры Савеце Міністраў нашай краіны, членам Прэзідыума НАН Беларусі і шэрага іншых навуковых саветаў. Да таго ж, ён старшыня савета АІПІ НАН Беларусі па абароне доктарскіх дысертацый.



*Сяргей Абламейка*

Сяргей Уладзіміравіч – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, прэмій НАН Беларусі за найлепшую манаграфію і за цыкл прац "Медыцынскія інфармацыйныя тэхналогіі і сістэмы". У 2002 г. яму была прызначаная стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Акрамя таго, С. Абламейка ўзнагароджаны Юбілейным знакам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы "10 гадоў з Дня аб'яднання народаў Беларусі і Расіі", знакам Расійскага авіяцыйна-касмічнага агенцтва "За міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне касманаўтыкі", Залатым медалём Ю. Гагарына Федэрацыі касманаўтыкі Расіі, Бронзавым медалём Норберта Вінера Міжнароднай акадэміі навук інфармацыйных тэхналогій за вялікі ўклад у развіццё інфарматыкі і іншымі ўзнагародамі.

Сяргей Уладзіміравіч жанаты, мае двух дзяцей.

**Падрыхтаваў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**СПАДЧЫНА ПІЧЭТЫ**
Да 130-годдзя з дня нараджэння першага рэктара Белдзяржуніверсітэта Уладзіміра Пічэты
**Стар. 2**

**ПЯЦЬ ПЫТАННЯЎ ПРА ВЫХАВАННЕ Ў БДУ**
Круглы стол з удзелам моладзевых лідараў універсітэта
**Стар. 3**

**ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ: ФРАГМЕНТЫ З ГІСТОРЫІ**
Фізфак БДУ святкуе сёлета сваё 50-годдзе
**Стар. 4**

**ТЭЛЕЦЭНТР: АДЛАДЗІЦЬ МЕХАНІЗМ**
У Беларускім дзяржаўным універсітэце пачалася рэалізацыя агульнарэспубліканскіх медыйных праектаў
**Стар. 7**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

РЭКТАР БДУ прафесар Сяргей Абламейка правёў сустрэчы з дэканамі, студэнцкім актывам БДУ, наведаў інтэрнаты і сустрэўся са студэнтамі. Кіраўнік універсітэта плануе азнаёміцца таксама з дзейнасцю ўсіх факультэтаў і вучэбных інстытутаў, НДІ і прадпрыемстваў.

ПРАРЭКТАР па вучэбнай рабоце Віктар Самахвал прыняў удзел у міжвузаўскім навукова-практычным семінары "Вопыт рэалізацыі інавацыйных адукацыйных праграм у расійскіх ВНУ: аналіз дасягненняў, перспектывы развіцця", які адбыўся ў Санкт-Пецярбургу. Падчас візіту падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Расійскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Герцэна, у рамках якой РДПУ абавязуецца перадаць БДУ 144 найменні навукова- і вучэбна-метадычнай літаратуры.

НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ прадукцыя БДУ была паспяхова прадстаўлена на Кітайскім міжнародным прамысловым кірмашы "CIIF-2008", які прайшоў у Шанхаі, а таксама на Нацыянальнай выставе нашай краіны "Беларусь-2008" у горадзе Дубай Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ВУЧОНЫ САВЕТ

24 лістапада ў будынку рэктарата на Бабруйскай, 5а адбудзецца пасяджэнне Вучонага савета БДУ. Прагучаць даклады прарэктара па навуковай рабоце Уладзіміра Панькова "Удзел падраздзяленняў БДУ ў выкананні дзяржаўных праграм", дырэктара НДІ ФХП Алега Івашкевіча аб выкананні дзяржпраграмы "Малатанажная хімія" і загадчыка кафедры фізвыхавання і спорту Віктара Каляды аб арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы ў БДУ. Пачатак у 10.15.

АЛЬМА-МАТЭР

# КЛАСІЧНЫЯ АТРЫБУТЫ БДУ

***27 кастрычніка на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 87-й гадавіне з дня заснавання Белдзяржуніверсітэта, Вучоны Савет ухваліў тэкст і музыку ГІМНА БДУ. Аўтарамі яго сталі паэт Леанід Дранько-Майсюк, кампазітары Ігар Лучанок і Сяргей Бельцюкоў.***

***Праца над гімнам доўжылася два гады. Першы варыянт на муз. І. Лучанка выконваўся ў кастрычніку 2006 года, затым вучань славутага кампазітара С. Бельцюкоў зрабіў новую аранжыроўку. І гэты варыянт прагучаў 1 верасня 2008 года на свяце "Віват, студэнт!". Цяпер мы маем трыяду сімвалаў класічнай ВНУ — герб, сцяг і гімн — аснову карпаратыўнага духу нашай універсітэцкай супольнасці.***

## ГІМН БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

*муз. І. Лучанка і С. Бельцюкова*
*сл. Л. Дранько-Майсюка*

Шчасце навукі – жаданае шчасце
У самастойным жыцці;
Трэба і розум, і сілу прыкласці,
Папараць-кветку знайсці.

**Прыпеў:**
Беларускі дзяржаўны універсітэт –
Дом навукі айчыннай і творчасці свет.
Веды слаўных вякоў у твой лёс увайшлі
І дабро нашай любай зямлі.

Светлы, прасторны, гасцінны і родны!
З будучыняй залатой!
Папараць-кветка галінкай лагоднай
Герб упрыгожыла твой.

**Прыпеў:**
Словы падзякі нібы дыяменты!
З іх мы ствараем хвалу:
Слава выкладчыкам, слава студэнтам,
Слава табе, БДУ!

**Прыпеў 2 разы**




ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ПІЧЭТАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

**На гістарычным факультэце 28–29 кастрычніка адбыліся Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя 130-годдзю з дня нараджэння першага рэктара БДУ, выдатнага вучонага-славіста, акадэміка Уладзіміра Пічэты.**

У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 120 даследчыкаў з Германіі, Украіны, Расіі, Палесціны, а таксама амаль з усіх ВНУ нашай краіны. Пленарнае пасяджэнне адкрылі прарэктар БДУ прафесар Уладзімір Клюня і дэкан гістарычнага факультэта дацэнт Сяргей Ходзін. Аб жыцці і дзейнасці У. Пічэты распавёў вядомы даследчык гіторыі БДУ прафесар А. Яноўскі. Складаны перыяд афармлення беларускай дзяржаўнасці ў 20-я гг. XX ст., у час якога адбывалася станаўленне БДУ, прааналізаваў прафесар У. Ладысеў. Асаблівасцям этнагенезу беларускага народа, адной з навуковых праблем, якую распрацоўваў У. Пічэта, прысвяціў свае выступленне госць з Украіны, прафесар Кіеўскага нацыянальнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі В. Яравы.

Усяго працавала сем секцый. Адна з іх называлася "У. І. Пічэта і развіццё вышэйшай школы і навукі". Іншыя так ці інакш былі звязаны з рознымі галінамі навуковай дзейнасці і спадчыны славутага акадэміка: гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя, гісторыя славянскіх краін, гісторыя Расіі, гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання. Ад многіх удзельнікаў канферэнцыі паступалі прапановы ўстанавіць мемарыяльную дошку на будынку гістарычнага факультэта, дзе знаходзіўся ў 1920-я гг. рабочы кабінет і кватэра У. Пічэты. Таксама выказаліся ініцыятывы выдаць неапублікаваныя навуковыя творы першага рэктара, якія захоўваюцца ў архіве Расійскай акадэміі навук, назваць адну з вуліц Мінска імем У. Пічэты.

**Аляксандр КАХАНОЎСКІ,**
**загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу**

# АПАНТАНЫЯ ГІСТОРЫЯЙ-2

**З 2006 года гістарычны факультэт праводзіць Дні беларускай гісторыі на іншых факультэтах. Сёлета ў красавіку такія мерапрыемствы былі праведзены намаганнямі Студсаюза і дэканатаў у ДзІКСТ, а 21–23 кастрычніка гасцей прымаў геаграфічны факультэт БДУ.**

Выкладчыкі кафедраў гісторыі Беларусі прачыталі цікавыя лекцыі, студэнты ж гістфака падрыхтавалі займальную віктарыну. Маладыя географы спаборнічалі ў веданні агульнай і айчыннай гісторыі, гісторыі БДУ, паказаўшы пры гэтым зайздросную шырыню кругагляду і кемлівасць. З асаблівым імпэтам студэнты ўдзельнічалі ў турах, дзе трэба было адгадаць асобу на партрэце і адказаць на пытанні па гісторыі альма-матэр.

Каманда КВЗ гістфака "З пятага разу", выступленне якой суправаджалася задзірыстым смехам і шырокімі ўсмешкамі, дапамагла ўдзельнікам расслабіцца пасля інтэлектуальных спаборніцтваў. Да таго ж, пераможцы віктарыны атрымалі падарункі, карысныя для студэнта. Напрыканцы мерапрыемства адбыўся маляўнічы рыцарскі турнір, зладжаны хлопцамі з рыцарскага клуба. Яны перанеслі гледачоў у атмасферу беларускага сярэднявечча, пазнаёмілі з побытам таго часу і пацешылі рухавымі конкурсамі.

Свята атрымалася. Яго папулярнасць паказвае, што Дні гісторыі ўжо сталі добрай традыцыяй. Хочацца выказаць падзяку ўсім арганізатарам за выдатны настрой, станоўчыя эмоцыі, а таксама за ўнёсак ва ўмацаванне сяброўства паміж факультэтамі!

**Ганна МОЛАШ**

НАША ГІСТОРЫЯ

# СПАДЧЫНА ПІЧЭТЫ

***Дзякуючы вучэбнаму курсу "Універсітэтазнаўства", які чытаецца з мінулага года ў БДУ, студэнты ведаюць, што першы рэктар alma mater Уладзімір Пічэта нарадзіўся 21 кастрычніка 1878 г. Такім чынам, гэтай восенню мы адзначаем яго 130-ю гадавіну.***

На гістарычным факультэце з гэтай нагоды прайшлі юбілейныя навуковыя чытанні. У каторы раз гучалі словы, і навукова-доказныя, і рытарычна-эмацыянальныя, пра тое, што мы не так многа зрабілі дзеля ўшанавання памяці гэтага чалавека не толькі ва універсітэце, але і ва ўсёй краіне.


Першы рэктар БДУ У. Пічэта

Таму нагадаем хаця б асобныя вынікі плённай 8-гадовай дзейнасці Уладзіміра Іванавіча на пасадзе рэктара БДУ. Выдатны вучоны і арганізатар адукацыі і навукі, ён пакінуў нам сапраўды каштоўную спадчыну. Перш за ўсё сам універсітэт як найвышэйшая сфера нашай цывілізаванасці. БДУ не змог бы адбыцца, калі б Уладзімір Іванавіч не ўклаў у яго сваю душу і сэрца, не змог бы пераадолець тысячы перашкод на шляху сталення.

Высокапрафесійны выкладчыцкі склад – галоўнае наша багацце. Першыя вядомыя навукоўцы ехалі на працу ў Мінск па асабістым запрашэнні Уладзіміра Іванавіча, які даваў гарантыі на працяг творчай дзейнасці ў сценах БДУ. У. Пічэта згадваў: "Справа ў тым, што шмат выдатных выкладчыкаў баяліся пераехаць ў Менск, што БДУ не будзе наогул існаваць. Аднак цэлая група выкладчыкаў усё ж такі пераехала і пачала весці шырокую арганізацыйную, будаўнічую справу". З іх, з "бацькоў-заснавальнікаў", распачалася слава нашай ВНУ. Першы рэктар сам чытаў лекцыі і праводзіў семінары па складаных і палітычна вострых, вузлавых праблемах гісторыі, права, эканомікі Беларусі, Расіі, славянскіх краін, гістарыяграфіі.

У. Пічэта разумеў, што Беларусі патрэбны эфектыўны "механізм" падрыхтоўкі ўласных навукова-педагагічных кадраў. Яго намаганнямі ў верасні 1927 г. была адкрыта аспірантура. Сам рэктар яшчэ ў 1925 г. узяў "пад сваё крыло" некалькі маладых гісторыкаў (Ф. Забэла, К. Кернажыцкі, А. Бурдзейка). Сярод творчай моладзі краіны ў 20-я гады асаблівай папулярнасцю карысталіся так званыя "пічэтнікі" – "мазгавыя штурмы", якія праводзіў рэктар БДУ са сваімі (і не толькі) вучнямі па тых ці іншых навуковых пытаннях. Ён мог потым зусім адказна напісаць: "Я сам вельмі многа рабіў, і пад маім кіраўніцтвам працягвалі працаваць больш маладыя людзі, у тым самым кірунку".

І вучні Пічэты ўспрымалі свайго настаўніка як выдатнага вучонага і педагога. Адны з першых студэнтаў БДУ Адам Сакольчык, Ніна і Мікалай Улашчыкі, Юлія Бібіла, Марыя Адзярыха і іншыя ў сваіх успамінах згадвалі, што іх прафесар быў "сапраўды вялікі вучоны-гісторык, таленавіты арганізатар, выдатны лектар, добры педагог...". Менавіта ён як ніхто іншы ставіў перад сваімі калегамі і студэнтамі мэту сабраць у адно цэлае ўсё багацце нацыянальнай спадчыны. "Тры вялікія мэты былі пакладзены ў аснову старажытнага адраджэння – будаванне беларускае літаратурна-мастацкае мовы, фармаванне беларускае інтэлігенцыі і напісанне беларускае гісторыі", – пісаў У. Пічэта.

Па ініцыятыве Уладзіміра Іванавіча распачалі сваю дзейнасць Навуковае таварыства БДУ, Таварыства гісторыі і старажытнасцяў. У 20-я гады Навуковае таварыства і Савет БДУ ладзілі сумесныя пасяджэнні для абмеркавання праблем прыродазнаўчых і гуманітарных навук. І ці не гэтага адзінства ў навуцы нам цяпер не хапае? Нельга забыць і тое, што У. Пічэта прасоўваў ідэю стварэння пры БДУ асобнага Інстытута па вывучэнні беларускай спадчыны. Яна была рэалізавана ў дзейнасці Інбелкульта, а потым Акадэміі навук БССР. Ці не забыліся пра гэта акадэмічныя навукоўцы, рыхтуючы святочныя мерапрыемствы з нагоды 80-годдзя НАН Беларусі? Дарэчы, а ці ўсведамляюць сённяшнія выкладчыкі і студэнты, якія карыстаюцца скарбніцамі Нацыянальнай, акадэмічнай і універсітэцкай бібліятэк, што першыя кніжныя зборы былі скрупулёзна сабраныя ў "Доме № 1 БДУ" па вуліцы Універсітэцкай (цяпер Кірава) таксама па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле рэктара?


Галоўны корпус БДУ. 1934 г.

Уладзімір Іванавіч напружана працаваў як навуковец-гісторык. Бібліяграфія яго прац "беларускага перыяду жыцця" ўнушальная. Але і дагэтуль у Асабістым фондзе Пічэты, які маецца ў архіве Расійскай акадэміі навук, ляжаць ненадрукаванымі некалькі рукапісаў яго прац, што былі напісаныя ці ў БДУ, ці ў АН БССР. Без сумневу, трэба як мага хутчэй распачаць іх навуковую апрацоўку з мэтай выдання ў серыі "Skriptor universitatis".

Рэктар не пакідаў па-за ўвагай нават дробязныя універсітэцкія праблемы. Ён асабіста працаваў над першымі вучэбнымі планамі і іх далейшым удасканальваннем, рыхтаваў правілы прыёму абітурыентаў і сам потым прымаў уступныя экзамены, не вельмі кіруючыся прынцыпамі "класавага адбору". У. Пічэта – стваральнік першага Статута БДУ. Для яго аднолькава важнымі былі праблемы побыту і выкладчыкаў, і студэнтаў. А чаго яму каштавала прывесці ў належны стан аўдыторны фонд, які быў выдзелены універсітэту беларускімі ўладамі... Так, на працягу першых 6 гадоў дзейнасці БДУ быў зроблены капітальны рамонт усіх будынкаў, былі абсталяваны кабінеты па асноўных вучэбных дысцыплінах, адчынены першы універсітэцкі музей – першабытнай культуры. Але БДУ імкліва рос, яму не хапала плошчаў для плённай працы, і рэктар ужо ў канцы 1924 г. змог "прабіць" ва ўрадзе пытанне пра неабходнасць узвядзення новага асобнага корпуса. Так неўзабаве быў створаны фізічны інстытут. На гэтым Уладзімір Іванавіч не спыніўся. На яго думку, БДУ павінен быў мець асобны гарадок: па ўзоры выбітных класічных універсітэтаў. І дабіўся рэалізацыі гэтай, здавалася, невырашальнай на той складаны час, ідэі. Трэцяя сесія ЦВК СССР у лютым 1927 г., а потым VIII з'езд саветаў БССР прынялі рашэнне пра будаўніцтва універсітэцкага гарадка ў Мінску, які ўжо ў 1930 г. прытуліў у сваіх аўдыторыях і кабінетах студэнтаў і выкладчыкаў новых ВНУ, якія "спарадзіў" Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Згаданае – толькі невялікі ўступ да працяглай і навукова выверанай размовы пра чалавека, якому так абавязана Беларусь у руху да пазнання сябе, суседзяў, сусвету.

**Прафесар Алег ЯНОЎСКІ,**
**загадчык кафедры гісторыі Расіі**
**Алена БАРАНАВА, выкладчык Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А. Куляшова**

ШКОЛА АКТЫВУ

# ПЯЦЬ ПЫТАННЯЎ ПРА ВЫХАВАННЕ Ў БДУ

***У БДУ ёсць багаты вопыт арганізацыі выхаваўчай работы з моладдзю. Кірункі дзейнасці, метады і формы работы пастаянна ўдасканальваюцца, расце колькасць студэнтаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у моладзевых грамадскіх арганізацыях універсітэта, БДУ неаднаразова станавіўся пераможцам рэспубліканскіх, гарадскіх і раённых аглядаў-конкурсаў, штогод праводзяцца шматлікія агульнауніверсітэцкія мерапрыемствы, ладзяцца дзесяткі конкурсаў.***

Разам з тым узнікае пытанне, а як самі студэнты ўспрымаюць і ацэньваюць выхаваўчую работу ва універсітэце? Гэтаму быў прысвечаны круглы стол, у якім бралі ўдзел прадстаўнікі адміністрацыі і лідары моладзевых арганізацый БДУ: Анастасія ГВАРДЗІЯН – старшыня ГА "Студэнцкі Саюз БДУ", Алег АЛЯКСЕЕНКА – старшыня студэнцкага Савета па якасці адукацыі БДУ, Дзмітрый МІКУЛКА – сакратар пярвічнай арганізацыі ГА "БРСМ" БДУ, Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ – начальнік Штаба працоўных спраў ГА "БРСМ" БДУ, Уладзімір СУВОРАЎ – прарэктар па навучальна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях, Павел СКАЛАБАН – начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (УВРМ), Генадзь ДЫЛЯН – начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы, Аляксей БАГАМАЗАЎ – намеснік начальніка УВРМ, Аляксандр ІГНАТЧЫК – начальнік аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ, Тамара СУВОРАВА – слухач Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, начальнік аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ у 2007–2008 навуч. годзе.

Слова – студэнцкім лідарам.



***Як, на ваш погляд, сучасная моладзь рэагуе на слова "выхаванне"?***

*А. Аляксеенка*: Для мяне відавочна, што тэрмін "выхаванне" разумеецца сёння не зусім правільна. Трэба мець на ўвазе, што мы маем справу з пакаленнем моладзі, якая вырасла і сфарміравалася ў эпоху галоснасці, калі падвяргаліся крытыцы метады выхавання, якія панавалі ў нашым грамадстве дзесяткі гадоў. І гэта вядзе да катэгарычнага непрымання любой спробы навязвання ідэй "зверху" і выклікае ў студэнтаў адмоўнае стаўленне да любых формаў і праяў грамадскага жыцця універсітэта або факультэтаў як да чагосьці абавязковага, што пагражае іх асабістаму часу. Універсітэт, выконваючы выхаваўчую функцыю, павінен стаць своеасаблівым супортарам – скіроўваць і падтрымліваць развіццё станоўчых якасцяў сваіх выхаванцаў. Гэта пашырыць кола студэнтаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці ВНУ, з далучэннем у гэты працэс прадстаўнікоў усіх без выключэння факультэтаў.

*Т. Суворава:* На маю думку, зараз адбываецца змена ў разуменні "выхавання". Калі я толькі пачынала працаваць ва ўпраўленні, я сама адчувала негатыўнае адценне гэтага слова. У апошнія гады адбываецца пераасэнсаванне яго значэння, у тым ліку і ў УВРМ. У пэўны момант мы ўсвядомілі, што наша першарадная задача заключаецца ў тым, каб студэнты разумелі, што выхаваўчая работа неабходная, першым чынам, самому студэнту для яго самарэалізацыі. І сталі ўсяляк пазіцыяніраваць гэтую ідэю сярод моладзі.

*П. Скалабан*: Дадам, менавіта таму сталі больш гаварыць не пра фарміраванне асобы з нейкімі зададзенымі якасцямі, а пра стварэнне ўмоў для яе паспяховага развіцця, сталі шырэй выкарыстоўвацца праектныя і конкурсныя формы працы. Напрыклад, з 2003 г. праводзіцца конкурс грантаў "Найлепшы моладзевы праект". Праекты-пераможцы атрымліваюць падтрымку і фінансаванне з боку універсітэта. Дзякуючы падтрымцы эфектыўна рэалізуюцца такія ініцыятывы, як "Студэнцкі цэнтр занятасці", "Студэнцкі інфармацыйны партал «Студэнцкае скрыжаванне»", адкрыты гарадскі фестываль моладзевых відэаролікаў "Кінагрань", "Трэнінгавы цэнтр", "Падзяліся цяплом душы сваёй", "Моладзевая ліга нацый БДУ", "Абуджэнне. Мастацкая фатаграфія як элемент арт-тэрапіі", "Мая школа" і шматлікія іншыя. Штогод праводзяцца конкурсы "Студэнт года" па чатырох намінацыях ("Лідар", "Навука", "Спорт", "Культура"), "Выпускнік года", "Найлепшая малатыражная студэнцкая газета", конкурс-выстава фотаработ, віктарыны, прысвечаныя дню заснавання універсітэта, Дню Перамогі, якія даюць студэнтам магчымасць рэалізаваць сябе ў розных відах дзейнасці. Час паказаў, што мы не памыліліся. Назіраецца значны рост даверу да нас, кіраўніцтва БДУ, усвядомленае праяўленне грамадзянскасці, патрыятызму. Сапраўды, гаварыць пра мэтанакіраванае фарміраванне асобы мы сталі меней, але наша работа ў цэлым засяроджана якраз на гэтым.



*У. Суворaў*: Заўважу, беларускае "выхаванне" дакладней адлюстроўвае падыходы БДУ, чым рускае "воспитание". "Схаваць" – у перакладзе на рускую мову "спрятать, скрыть". "Выхаваць" – нясе сэнс "открыть, высвободить". Ды і само гучанне гэтага слова выклікае адчуванне клопату і беражлівасці.

***Ці змянілася што-небудзь у арганізацыі выхаваўчай работы універсітэта ў 2007–2008 навучальным годзе?***

*А. Аляксеенка*: У параўнанні з тым, што было два-тры гады таму, ёсць вельмі сур'ёзныя зрухі. Прынамсі, па маштабнасці мерапрыемстваў, па іх асвятленні і абмеркаванні ў студэнцкім асяроддзі. Напрыклад, на факультэтах студэнты малодшых курсаў пачынаюць арыентавацца і пытаць пра будучыя мерапрыемствы, выказваюць жаданне паўдзельнічаць у іх. Я такога раней не заўважаў!

*А. Гвардзіян*: Калі гаварыць пра змены, мне падаецца, па-першае, ёсць прагрэс у актыўнасці, пра якую гаварыў Алег, а па-другое, адбылося рэальнае аб'яднанне сіл і магчымасцяў адміністрацыі і студэнцкіх арганізацый. Гэта асабліва адчулася пры падрыхтоўцы святкавання 86-й гадавіны універсітэта. Студэнты самі прыдумалі канцэпцыю "Я люблю БДУ", і яе падтрымала кіраўніцтва. Усе працавалі разам – гэта было проста выдатна! Студэнты перасталі баяцца праяўляць ініцыятыву і зразумелі, што тут іх падтрымаюць. У кастрычніку гэтага года прайшла школа старастаў у "Брыганціне". І літаральна на наступны дзень сталі прыходзіць студэнты і казаць: "Як у вас цудоўна! Мы таксама хочам што-небудзь рабіць!". Спачатку яны забіралі фатаграфіі, потым – узялі аб'яву на факультэт. З'явілася адкрытасць.

*Дз. Мікулка*: Што датычыцца дзейнасці БРСМ, то пераломным момантам стала грамадска-адукацыйная гульня "Твой выбар" у сакавіку 2008 года. Тады ўпершыню адбыліся рэальныя альтэрнатыўныя выбары сакратара пярвічнай арганізацыі, а сумленная перадвыбарная барацьба і здаровая канкурэнцыя сярод кандыдатаў і іх штабоў па-сапраўднаму дазволіла сфарміраваць каманду аднадумцаў. Моладзь паверыла, што арганізацыя можа жыць, што гэта актыў, сіла універсітэта. Паступова пераадольваем тое негатыўнае стаўленне да арганізацыі, якое сфарміравалася яшчэ ў школе, дзе часта маладых людзей проста "заганяюць" у яе шэрагі. Зараз ажываюць нашы стэнды на факультэтах, студэнты перастаюць саромецца быць членам БРСМ. 17–19 кастрычніка правялі семінары для свайго актыву ў "Брыганціне". Гэта вялікі крок. Хлопцы і дзяўчаты яшчэ раз упэўніліся, што яны могуць нешта рабіць, рэалізоўваць свае праекты, могуць падтрымаць свой універсітэт.



*У. Суворaў задаволены дыскусіяй*

*Дз. Лебедзь*: Расце зацікаўленасць студэнтаў у працаўладкаванні ў вольны ад вучобы час. Паступова павялічваецца колькасць будатрадаў БДУ. Так, напрыклад, у 2006 г. было 2 будатрады, у 2007 – 5, а гэтым летам працавала ўжо 8 брыгад. Усяго за мінулы навучальны год працаўладкавана больш за тысячу студэнтаў. Мы сталі рэальнымі канкурэнтамі для іншых ВНУ ў сферы другаснай занятасці моладзі. Па выніках мінулага працоўнага семестра будаўнічы студатрад БДУ "Вымпел" стаў пераможцам гарадскога конкурсу, студэнцкі сельгасатрад "Шчомысліца" адзначаны ЦК БРСМ па выніках рэспубліканскага конкурсу "Найлепшы студэнцкі атрад ГА «БРСМ»", а Штаб працоўных спраў пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУ стаў пераможцам гарадскога конкурсу сярод аналагічных структур.

*А. Гвардзіян*: Зрух ёсць і ў інфармаванні. Шмат класных мерапрыемстваў, але не ўсе пра іх ведаюць. Зараз студэнты сталі выяўляць вялікую зацікаўленасць. Узнікла сувязь з аддаленымі факультэтамі. У нас ёсць сайт "Студэнцкае скрыжаванне" (www.studcross.by), дзе размяшчаецца адпаведная інфармацыя. На факультэтах сталі выдавацца студэнцкія газеты. Але тут мы сутыкнуліся з праблемай іх друкавання, не ўсюды адміністрацыя гатовая падтрымліваць рэдкалегіі гэтых выданняў, вылучыць квоту на тыражаванне, забяспечыць паперай.

*А. Багамазаў*: Сустрэчнае пытанне: а наколькі эфектыўна універсітэту ўкладваць грошы ў такія выданні? Яны існуюць толькі для таго, каб яны проста былі, або яны чымсьці дапамагаюць студэнтам, калі так, то чым?

*А. Аляксеенка*: Па-першае, студэнцкія газеты выконваюць інфармацыйную функцыю, падаюць матэрыял для студэнтаў ад студэнтаў. Па-другое, хлопцы і дзяўчаты, якія ўваходзяць у рэдкалегіі, задзейнічаныя ў пазавучэбнай дзейнасці, у іх ёсць агульная мэта, што спрыяе фарміраванню калектыву. Набываюцца навыкі ў зборы інфармацыі, іх аналізе, спосабах падачы матэрыялу. Выконваецца адна з педагагічных функцый універсітэта – развіццёвая. Хтосьці займаецца спортам, танчыць або спявае, малюе, а хтосьці выпускае газеты, няхай і студэнцкія. Я думаю, гэта важная цаглінка ў выхаваўчай рабоце.

*Дз. Мікулка*: Самае галоўнае ў гэтых газетах тое, што іх пішуць самі студэнты і на зразумелай для іх мове. Студэнты ім давяраюць, таму што пішуць іх аднакурснікі, знаёмыя і сябры. Гэта яшчэ адна магчымасць выказацца... Для адкрытага дыялогу па арганізацыі адукацыйнага працэсу паміж адміністрацыяй і студэнцтвам ва універсітэце неабходна падтрымліваць дзейнасць малатыражных студэнцкіх газет на факультэтах.

***Дзе павінен быць цэнтр студэнцкага жыцця і пазавучэбнай работы, на ўзроўні факультэта або універсітэта? Адкуль павінна ісці ініцыятыва: знізу або зверху?***

*А. Ігнатчык*: Калі я быў студэнтам, мне не было куды прыйсці са сваімі ідэямі і праектамі. Зараз у БДУ створаныя такія магчымасці. Але відавочная праблема: чамусьці студэнты акумулююцца на вяршыні айсберга, на універсітэцкім узроўні. А вось нізавы ўзровень, факультэцкі, "прастрэльвае". А групавы і пагатоў. На мой погляд, гэта звязана са зменай сацыяльных арыенціраў. Сёння іншыя ўмовы. Ні куратар, ні стараста навучальнай групы не валодае тымі паўнамоцтвамі, што былі раней. Група сёння не з'яўляецца ядром.

*Дз. Мікулка*: Лічу, што цэнтр студэнцкага жыцця не можа быць адзін, але мусіць быць вызначаная структураванасць і каардынацыя дзейнасці. Не маючы "моцнага" актыву на факультэтах, мы не дасягнем вынікаў і на ўзроўні універсітэта. Але трэба, каб лідары факультэтаў дакладна разумелі, што актыўнасць студэнтаў яны павінны скіроўваць у агульных інтарэсах. Таму асноўная задача – сфарміраваць такіх лідараў.

*А. Гвардзіян*: Шматлікія факультэты універсітэта размешчаныя ў розных, парой аддаленых, карпусах. Большасць студэнтаў не выходзяць за рамкі свайго падраздзялення, правучыўшыся там 5 гадоў. Некаторыя лічаць, што БДУ – гэта толькі іх факультэт, і не асацыююць сябе з усім універсітэтам. Тут павінен быць нейкі кампраміс. Бо важная атмасфера і жыццё як унутры факультэта, так і ва універсітэце ў цэлым. А наконт ініцыятывы магу сказаць, што не так важна, ад каго яна ідзе, важней, ці знаходзіць яна водгук, ці будзе яна мець развіццё і ўвасабленне.

***Актыўнасць студэнтаў расце, але БДУ не можа рэалізаваць усе іх ініцыятывы. Напрыклад, фінансаванне конкурсу грантаў "Найлепшы моладзевы праект" у 2003 годзе складала 2 млн. рублёў, летась – 10 млн. Які выхад з дадзенай сітуацыі?***

*Дз. Мікулка:* Моладзевы праект, як і любы іншы, ставіць сваёй мэтай атрыманне пэўнага выніку. Гэта значыць, фундатары, якія ўкладаюць свае сродкі, чакаюць пэўнай карысці (павелічэнне сацыяльнай актыўнасці студэнтаў, атрыманне прыбытку, фарміраванне пачуцця патрыятызму і г. д.). Аўтары-распрацоўшчыкі праекта павінны разумець, што калі яны просяць сродкі ва універсітэта, то канчатковыя вынікі павінны адпавядаць задачам універсітэта, адлюстраваныя, напрыклад, у статуце БДУ.

*А. Гвардзіян*: Я лічу, што калі стваральнікі праекта гатовыя ім займацца сур'ёзна, то чакаць фінансавання, да прыкладу, год яны не будуць. Бо, калі гарэць вочы і ты ўпэўнены ў сабе і сваёй камандзе, можна самім знайсці крыніцы, пераканаць іншых дапамагчы. А да арганізатараў дадзенага конкурсу ў мяне ёсць прапанова: дадаць у яго больш галоснасці. Напрыклад, на заключным этапе прыцягваць аўтараў праекта для публічнай абароны свайго тварэння. Гэта надасць конкурсу адкрытасці, і самі студэнты набудуць дадатковыя навыкі.

***Ідэалогія БДУ – які сэнс вы ўкладваеце ў гэтае паняцце?***

*Дз. Мікулка:* На сёння БДУ з'яўляецца вядучай ВНУ краіны. І, на мой погляд, усе – ад студэнта да прафесара – павінны падтрымліваць гэты брэнд, фарміруючы пры гэтым асаблівы, "універсітэцкі", дух.

*Г. Дылян*: Ідэалогія БДУ выяўляецца трыма словамі: гэта буйны адукацыйны, навуковы і культурны цэнтр нашай краіны. У гэтай сукупнасці і заключаецца яго ідэалогія. Студэнты, пры жаданні, вядома, праходзяць праз усе гэтыя тры складнікі.

*А. Гвардзіян*: Для мяне універсітэт не толькі цэнтр адукацыі, навукі, культуры, але і штосьці большае. Ён як хата, у якім жыве сям'я, дзе свае традыцыі, свая атмасфера. Магчыма, менавіта праз такое ўсведамленне можна прышчапіць студэнтам разуменне значнасці альма-матэр, тое, якую важную ролю грае яна ў шматлікіх сферах жыцця, і нас саміх, і нашага грамадства, і краіны ў цэлым.

**Ганна ХОЛАД**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

СВЯТКАВАННІ

# Фізічны факультэт: фрагменты з гісторыі

***У гэтым годзе фізічнаму факультэту БДУ спаўняецца 50 год. Звернемся да старонак мінулага і зазірнём у дзень сённяшні аднаго з асноваўтваральных падраздзяленняў БДУ.***



## АСОБЫ

Зараз зразумела, што гісторыю робяць выбітныя постаці, якіх на фізічным факультэце заўсёды хапала. На жаль, цяперашнім студэнтам мала што гавораць такія прозвішчы, як Сцяпанаў, Сірата, Сеўчанка, Ельяшэвіч... – заснавальнікаў інстытута фізікі ў нашай краіне. Пра іх слаўную дзейнасць расказаць у некалькіх радках немагчыма. Таму спынімся на ключавых момантах існавання факультэта.

Самым першым дэканам фізфака быў Міхаіл Халімановіч. Затым – Леанід Валодзька, Іван Зяцькоў, Эдуард Шпілеўскі, Віктар Гайсёнак, Анатоль Клішчанка і Віктар Анішчык, кожны з якіх зрабіў значны ўнёсак у развіццё факультэта. Прафесар Анатоль Пятровіч Клішчанка ўзначальвае кафедру атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, прафесар Віктар Анатольевіч Гайсёнак з'яўляецца Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Польшчы. Эдуард Міхайлавіч Шпілеўскі кіруе аддзелам у Інстытуце цепла- і масаабмену НАН Беларусі.

## АДБІТКІ ПАДЗЕЙ

**Напачатку.** Гісторыя фізічнага факультэта пачалася ў 1922 г. з адкрыццём фізіка-матэматычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ, і толькі праз адзінаццаць год, у 1933-м, узнік асобны фізіка-матэматычны факультэт. Да вайны на ім былі створаны чатыры фізічныя кафедры. Тады ж амаль усе выкладчыкі і студэнты пайшлі на фронт, некаторых эвакуіравалі ў тыл. Аднавіў сваю дзейнасць факультэт толькі ў 1943 г. пад Масквой, і ў гэты час тут навучалася 27 студэнтаў. А ў 1944 г. фізфак разам з БДУ вярнуўся ў Мінск у складзе толькі дзвюх кафедраў: тэарэтычнай і агульнай фізікі.

**Асобны факультэт.** Падзел фізіка-матэматычнага факультэта на асобныя структуры адбыўся ў 1958 г. Да вайны вучэбны працэс быў змешаны, а аддзяленні на факультэце вызначаліся па моўнай



*Прафесары М. Ельяшэвіч і Ф. Фёдараў уручаюць дыпломы выпускнікам фізфака*

прыкмеце. Іх было два: беларускае і яўрэйскае. Пасля вайны пачалося дыферэнцыраванае фізічнае і матэматычнае навучанне, што і стварыла глебу для далейшага падзелу.

***Анатоль Клішчанка* (дэкан з 1988 г. да 1997 г.):**

– Студэнцкія гады былі, мабыць, такімі ж, як і зараз у моладзі. У той час шырока развівалася дзейнасць будаўнічых атрадаў. Для многіх студэнтаў, асабліва немінчан, лета было магчымасцю зарабіць грошы, каб далей пратрымацца на працягу года. Стыпендыя ў той час была, наколькі я памятаю, 35 рублёў, а павышаная – 44. У мінчан яна была крыху меншай. Большасць будатрадаў накіроўвалася на Поўнач і ў Сібір, дзе ўзводзілі дамы і вытворчыя аб'екты. Я ж асабіста паездзіў толькі па Беларусі – увосень на бульбу. Акрамя таго, у нас былі вельмі з'ядналыя вучэбныя групы. Мы разам сустракалі святы, ездзілі на прыроду, шмат займаліся спортам. Нам не хапала часу, каб паспець усё. Але ў нас была прага ведаў і жаданне стаць сапраўднымі спецыялістамі.

***Эдуард Шпілеўскі*: (дэкан з 1979 г. да 1986 г.):**

– Пасля першага курса амаль усе мае аднакашнікі чатыры месяцы працавалі на цаліне. 1958-ы год быў самым ураджайным у Казахстане. Я ўзначаліў атрад колькасцю 108 чалавек. Мы датэрмінова здалі экзамены і ўжо 7 чэрвеня выехалі ў Сярэднюю Азію, а вярнуліся толькі 30 кастрычніка. Тады і даведаліся, што ў нас цяпер асобны факультэт. Яго першым дэканам стаў Міхаіл Панцялеевіч Халімановіч, выкладчык тэарэтычнай механікі, якога мы паважалі і любілі за грунтоўныя лекцыі і за дапамогу студэнтам. Неабходнасць падзелу факультэта была звязана з высокай запатрабаванасцю ў матэматыках і фізіках для новых прадпрыемстваў. У час вайны і асабліва пасля яе заканчэння навука бурліва развівалася, яна стала залогам агульнапалітычнага поспеху. У Мінску, акрамя аўтамабільнага і трактарнага заводаў, былі пабудаваны прыборабудаўнічы (імя У. Леніна) і аптычны (імя С. Вавілава) заводы, завод матэматычных машын і завод мікраэлектронных прыстасаванняў і прыбораў (ПА-"Інтэграл"), апошні пазней пашырыўся да 7 заводаў.

Факультэт павялічваў прыём студэнтаў, ствараліся новыя кафедры, навуковыя лабараторыі, адкрылася вячэрняе аддзяленне, на якім вучыліся маладыя працаўнікі нядаўна створанай навукаёмкай вытворчасці.

**Традыцыі.** Дні Фізіка праводзяцца з 1973 г. Як жа ўзнікла гэта традыцыя?

***Эдуард Шпілеўскі:***

– Была ў нас студэнтка Люба Турбіна (зараз вядомая паэтэса. – *Рэд.*). Менавіта яна была завадатаркай. І песню, якая цяпер з'яўляецца гімнам факультэта, яна прывезла з фізфака МДУ. Ідэя ўсім адразу спадабалася, і песня стала папулярнай.

***Віктар Гайсёнак* (дэкан з 1986 г. да 1988 г.):**

– Да правядзення першых Дзён Фізіка я меў непасрэдныя адносіны. У той час я ўжо працаваў на кафедры агульнай фізікі і адначасова быў сакратаром камсамола факультэта. Студэнты старэйшых курсаў звярнуліся ў камітэт па дапамогу ў арганізацыі такога мерапрыемства. Пазней і іншыя факультэты падхапілі нашу ідэю, але фізфак быў пачынальнікам. На спектаклі-пасвячэнні я сваю ролю граў з жыцця – ролю сакратара камітэта камсамола роднага факультэта.

**Стварэнне новага.** Жыццё ідзе, і факультэт не стаіць на месцы. Адной з найбольш значных старонак для любой такой установы з'яўляецца стварэнне новых навуковых кірункаў, адкрыццё новых кафедраў.

***Эдуард Шпілеўскі:***

– Увогуле, хуткае развіццё універсітэта з канца 1950-х гг. было звязана з прыездам з Масквы і Ленінграда кагорты навукоўцаў. Перш за ўсё, Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі, які потым запрасіў Барыса Іванавіча Сцяпанава і Міхаіла Аляксандравіча Ельяшэвіча. Яны стаялі ля вытокаў стварэння моцнай навуковай фізічнай школы і фундаментальнай фізіка-матэматычнай адукацыі ў Беларусі. Заснавальнікам кафедры фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў стаў акадэмік Мікалай Мікалаевіч Сірата. Ён жа заснаваў інстытут і ўдзельнічаў у стварэнні завода матэматычных машын і "Інтэграла". Кафедры оптыкі стварылі Б. І. Сцяпанаў і А. Н. Сеўчанка, адначасова ўзнік завод імя Вавілава і аптычная вытворчасць. Там выраблялі не толькі фотаапараты, але і ваенную тэхніку, прыборы начнога бачання. Вопыт МДУ, Ленінградскага універсітэта і Дзяржаўнага аптычнага інстытута быў перанесены сюды, добрыя традыцыі гэтых слынных устаноў прывіліся і ў нас.



*У Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследаванняў г. Дубна (Расія)*

***Анатоль Клішчанка:***

– Сёлета напрыканцы лістапада мы будзем святкаваць 25-годдзе кафедры атамнай фізікі. Ля яе вытокаў стаяў акадэмік М.А. Ельяшэвіч, лаўрэат Ленінскай прэміі. З 1968 г. яна называлася кафедрай атамнай і малекулярнай фізікі і мела выключна тэарэтычную накіраванасць, таму што Міхаіл Аляксандравіч прымаў удзел у даследаваннях і выпрабаваннях атамнай і вадароднай бомбы, а дакладней, ён займаўся аптычнымі даследаваннямі выбухаў. Пасля яго сыходу ў канцы 1970-х гг. кафедра спыніла сваё існаванне. А ў 1983 г. рэктар БДУ фізік Леанід Іванавіч Кісялеўскі стварыў кафедру атамнай фізікі са спецыялізацыяй па фізіцы плазмы. Крыху пазней з'явіўся Рэспубліканскі цэнтр касмічных даследаванняў, звязаны са стварэннем прыбораў і распрацоўкай метадаў дыягностыкі паверхні Зямлі і космасу, стварэннем лятальных апаратаў. Пад гэты напрамак Л. І. Кісялеўскі прапанаваў увесці спецыялізацыю па фізічнай інфарматыцы, а кафедру пера-тварыць у кафедру атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі.

***Віктар Гайсёнак:***

– У сярэдзіне 80-х гадоў станавілася ўсё больш зразумела, што развіццё інфарматыкі будзе вызначаць развіццё і астатніх навук. У гэты час інфарматыка на факультэце выкладалася кафедрай электронна-вылічальных машын. Праграма гэтага курса патрабавала мадэрнізацыі, было неабходна ўлічыць спецыфіку фізікі і раскрыць яе магчымасці. Так узнікла кафедра методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, якую я ўзначаліў. Акрамя таго, на базе гэтай кафедры была створана новая спецыялізацыя па мадэляванні фізічных працэсаў з дапамогай ЭВМ. З моманту стварэння яна карысталася выключнай папулярнасцю сярод студэнтаў.

## СУЧАСНАСЦЬ

Ужо больш за дзесяць год факультэт узначальвае прафесар Віктар Анішчык, а таксама ён загадвае кафедрай фізікі цвёрдага цела. Выбітны навуковец з'яўляецца да таго ж і заўзятым спартсменам. Яму больш за ўсіх вядомы сённяшні факультэт, яго поспехі і цяжкасці.

***Якія падзеі студэнцкага жыцця Вам запомніліся болей за ўсё?***

– Больш за ўсё – першая абарона курсавой працы і першае выступленне на навуковай канферэнцыі, тады і зведаў, што такое мандраж. Я і мой таварыш пачалі займацца навукай на кафедры з трэцяга курса, і абараняліся мы раней за астатніх студэнтаў. Гэта было ў той час прэстыжна.

***Чым характарызавалася тагачасная навука?***

– Больш шырокімі, як гэта ні дзіўна, магчымасцямі. Мы планавалі, што трэба зрабіць, заказвалі неабходныя прыборы і праз год іх атрымлівалі. 60-я – 70-я гады – гэта залаты век навукі ў Савецкім Саюзе. Навука была галоўным прыярытэтам дзяржавы. Адукацыя тады была не горшая, калі не сказаць лепшая, хаця шматлікія рэчы былі даволі прымітыўнымі. Курсавую працу, напрыклад, пісалі ў звычайным школьным сшытку. Пазней я знайшоў шмат такіх прац і падараваў іх аўтарам: дактарам навук, прафесарам. Сам факультэт у той час пашыраўся вельмі хутка: ён пакінуў будынак сучаснага рэктарата і пераехаў у асобны корпус.

***Чым адрозніваецца цяперашні факультэт у параўнанні з тагачасным?***

– Вельмі значна розніца, хаця б самім будынкам. Ён эксплуатуецца ўжо 8 год, але захоўваецца добра. Студэнтам тут падабаецца. А ўвогуле, мы пасталелі. Гэта натуральна і непазбежна. Мы робім захады, каб пераламіць сітуацыю. Зараз маем сучаснае абсталяванне. А вось адносіны студэнтаў сталі горшымі. І гэта не таму, што раней "вода была мокрее, а солнце ярче". Юнакі абыякава ставяцца да сваёй адукацыі, не думаючы пра дрэнныя для сябе наступствы ў будучыні. Агульны ўзровень добры, але жадання вучыцца ў мой час было болей.

Раней на факультэце былі вялікія конкурсы і большы набор студэнтаў, а зараз колькасць ахвотных стаць фізікамі значна зменшылася...

Мы жывём у постіндустрыяльным грамадстве. Усе імкнуцца разважаць на філасофскія і псіхалагічныя тэмы, корпацца ў сваёй душы, а яшчэ лепш – у душах іншых людзей, у найлепшым выпадку пісаць вершы. Фізіка перажывае крызіс ва ўсім свеце. У Англіі, напрыклад, праблемы тыя ж самыя: малы заробак настаўнікаў, нежаданне дзяцей вучыцца. На фізфаку вучыцца цяжка, але пасля яго лёгка вучыцца на любым іншым факультэце. Дастаткова паглядзець, кім працуюць нашыя выпускнікі.

***Якую ролю грае студэнцкая навука?***

– На першым курсе навукі не павінна быць, а вось з другога курса можна і трэба ісці на кафедру і займацца даследаваннямі. Гэта вельмі важна, таму што, калі займаешся навукай, ты перагортваеш кніжкі, капаешся ў інтэрнэце, шукаеш матэрыялы, – вучышся вучыцца. Самая навука – пакуль ты аспірант, да дацэнта. Пасля навука ідзе на спад.

***50 год фізічнаму факультэту – што азначае гэтая дата?***

– Памятаеце, Ганна Герман спявала: "Только раз бывает 18 лет..."? Гэта веха, альбо рыса, якая падвядзе вынікі самосці, умоўна кажучы. Час рашыць, што рабіць далей. 50 год – гэта не шмат, а палова стагоддзя – гэта цэлае жыццё, два пакаленні. Школа фізікі ў нас склалася, ды і ўзровень выкладання добры. Калі б не было універсітэта, не было б фізфака – не было б і фізікі ў Беларусі. Мы пераступім гэты рубеж і будзем развівацца і змяняцца далей.

**Падрыхтавала Надзея КУХАРЧЫК**

ВІНШУЕМ!

# ФОРУМ ЧАТЫРОХГОДДЗЯ

***З 3 па 6 лістапада ў БДУ праходзіла X Беларуская матэматычная канферэнцыя, якая падвяла вынікі працы айчынных даследчыкаў за апошнія чатыры гады.***

Навуковая праграма мерапрыемства ўключала ўсе сучасныя кірункі матэматычнай навукі. Працавалі 15 секцый, пасяджэнні якіх прайшлі ў БДУ, Інстытуце матэматыкі НАН Беларусі, БДПУ і БДУІР. Удзел бралі звыш 700 навукоўцаў з12 краін свету.

Канферэнцыя ўрачыста адкрылася ў Ліцэі БДУ выступленнямі сустаршыняў: дырэктара Інстытута матэматыкі НАН Беларусі, акадэміка Івана Гайшуна і першага намесніка міністра адукацыі прафесара Аляксандра Жука. Павіталў усіх удзельнікаў і рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Сяргей Абламейка.

Сярод гасцей мерапрыемства такія вядомыя навукоўцы, як акадэмік, герой Беларусі М. Высоцкі, акадэмік І. Гайшун, акадэмік М. Ізобаў, рэктар Гродненскага дзяржуніверсітэта прафесар Я. Роўба, рэктар універсітэта Нові Пазар (Югаславія), прафесар Ч. Далічанін, член-карэспандэнт РАН А. Махнеў, намеснік дырэктара літоўскага Інстытута матэматыкі і інфарматыкі прафесар С. Руткаускас.

Першы дзень работы канферэнцыі быў прысвечаны *50-годдзю з дня заснавання механіка-матэматычнага факультэта*. На ўрачыстым пасяджэнні яго найлепшым прадстаўнікам былі ўручаны граматы Міністэрства адукацыі, БДУ і падзякі рэктара.



*У прэзідыуме (злева направа) А. Жук, С. Абламейка, І. Гайшун*

Прагучалі даклады пра асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў, якія праводзяцца на факультэце.

Механіка-матэматычны факультэт – вядучы адукацыйны і навуковы цэнтр Беларусі ў адпаведнай галіне ведаў. У яго складзе дзесяць кафедраў, вучэбны цэнтр інфармацыйных тэхналогій, дзве навукова-даследчыя лабараторыі (прыкладной механікі і прыкладных метадаў матэматычнага аналізу), а таксама студэнцкая НДЛ "Дыскрэтныя структуры і алгарытмы".

Адукацыйныя паслугі і навуковы патэнцыял мехмата адпавядаюць сусветнаму ўзроўню і добра вядомыя ў шматлікіх краінах свету. Студэнты мехмата атрымліваюць выдатную падрыхтоўку і працаўладкоўваюцца ў вядучых ВНУ і навукова-даследчых установах рэспублікі, IT-фірмах, а таксама ў канструктарскіх бюро, банках, на прадпрыемствах розных галін сучаснай прамысловасці і народнай гаспадаркі.

**дацэнт Сяргей РАГОЗІН, вучоны сакратар аргкамітэта**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## СІНДРОМ ПЕРАМОЖЦАЎ

**У БДУ на базе ФПМІ 23–25 кастрычніка адбыліся 11-ыя чвэрцьфінальныя камандныя спаборніцтвы чэмпіянату свету па праграмаванні ACM (Association for Computing Machinery) сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна.**

У згаданых спаборніцтвах у афіцыйным заліку ўзялі ўдзел 43 каманды, з іх 26 каманд з вядучых ВНУ Беларусі, 4 – з Эстоніі (Тарту і Талін), 6 – з Літвы (Вільнюс і Каўнас), 4 – з Латвіі (Рыга), і 3 – з Расіі (Калінінград). Студэнтам для рашэння было прапанавана 2 задачы на папярэднім (выпрабавальным) туры і 9 задач, якія трэба было рашыць за 5 гадзін асноўнага тура спаборніцтваў.

У выніку абсалютнымі пераможцамі чвэрцьфіналу сталі дзве каманды ФПМІ БДУ (Аляксей Тоўсцікаў, Аляксей Лабанаў, Міхаіл Блоцкі і Філіп Пронін, Сяргей Ціхан, Дзмітрый Рудоль), якія рашылі па 6 задач і атрымалі дыпломы І ступені. Усяго ж у наступны этап па наяўнай квоце кваліфікаваліся 3 каманды БДУ, 2 каманды БДУІР, каманда Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама 2 каманды Расійскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Канта, 2 з Латвіі і 3 з Літвы.

Дапамагала ў набыцці прызоў для пераможцаў навукова-тэхналагічная асацыяцыя "Інфапарк" (дырэктар – Уладзімір Басько), а спонсарам выступіла кампанія "Эксіжан-Сервісіз", якую прадстаўляў Сяргей Сцепанцоў – выпускнік БДУ, фіналіст чэмпіянату свету 2000 г.

Дарэчы, сярод каманд беларускіх ВНУ праводзіўся асобны конкурс у рамках Рэспубліканскай студэнцкай алімпіяды па праграмаванні. Тры першыя месцы заваявалі таксама студэнты нашага ўніверсітэта.

Паўфінальныя спаборніцтвы чэмпіянату свету па праграмаванні пройдуць у канцы лістапада ў Санкт-Пецярбургу. У паўночнай расійскай сталіцы разгорнецца ўпартая барацьба з самымі моцнымі камандамі Расіі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Казахстана і інш. (больш за 150 каманд) за права выхаду ў фінал, які адбудзецца ў красавіку 2009 г. ў Стакгольме (Швецыя).

**Кацярына ПАЗЮРА, дырэктар Заходняга рэгіёна**

## ГУЛЬНІ РОЗУМУ

***Каманда магістратуры эканамічнага факультэта БДУ перамагла ў 2-м туры і выйшла ў фінал спаборніцтваў па стратэгічным менеджменце GMC Беларусь-2008.***

Global Management Challenge – найбуйнейшае ў свеце спаборніцтва па стратэгічным кіраванні бізнэс-кампаніяй для менеджараў сярэдняга і вышэйшага звяна. На працягу 2-х этапаў спаборніцтва (май-чэрвень і верасень-кастрычнік) каманды найлепшых беларускіх менеджараў кіравалі віртуальнымі кампаніямі, прымаючы кожны тыдзень 66 кіраўніцкіх рашэнняў. Сярод 24 камандаў былі прадстаўлены вядучыя прадпрыемствы і навучальныя ўстановы Беларусі.

Сутнасць гульні простая, а працэс займальны і складаны. У падначаленні кожнай каманды менеджараў меліся віртуальныя кампаніі з роўнымі стартавымі ўмовамі. І кіраўнікам трэба, канкуруючы з іншымі кампаніямі, падняць да найвышэйшага ўзроўню свае акцыі – распрацаваўшы правільную стратэгію і прааналізаваўшы сітуацыю на рынках збыту.

Урэшце, упэўнена перамагла каманда магістратуры эканамфака БДУ "Новая ініцыятыва", адарваўшыся ад самага блізкага канкурэнта на 11%. За выдатныя дасягненні калектыў быў ганараваны прэміяй "Global Award 2008" у намінацыі "Прарыў года". Усяго ў вочным фінале, які адбудзецца 24 лістапада, будуць удзельнічаць 8 найлепшых камандаў, а пераможца нацыянальных спаборніцтваў атрымае права прадстаўляць Беларусь на Міжнародным фінале Global Management Challenge-2009 у Партугаліі.

**Аляксандр ШАШКО, капітан каманды**

ДОБРАЯ СПРАВА

## Хто працуе, той не сумуе

*Падведзены вынікі Працоўнага семестра – 2008.*



З 1 ліпеня да 1 верасня каля тысячы студэнтаў нашага ўніверсітэта рупліва завіхаліся ў складзе студэнцкіх брыгад рознай скіраванасці. Усяго ўлетку Штаб працоўных спраў БРСМ разам са Студсаюзам і ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю сфарміравалі 14 атрадаў: 8 будаўнічых, 2 валанцёрскія, па адным сельскагаспадарчым, педагагічным, экалагічным і сэрвісным.

Найбольш буйныя будаўнічыя атрады працавалі на рэканструкцыі часткі аўтадарогі М2, на ўзвядзенні ФАК "Серабранка", рэканструкцыі бальніцы хуткай дапамогі (блок Г).

Сёлета асаблівая ўвага была нададзена забеспячэнню працай дзяўчат. Ажно 50 іх далучыліся да трох будаўнічых атрадаў. Студэнты з валанцёрскіх атрадаў дапамагалі ветэранам і дзіцячым дамам, сэрвісны атрад – прыёмнай камісіі БДУ, а экалагічны атрад упарадкоўваў тэрыторыю музея ў Вязынцы.

Цырымонія закрыцця Трэцяга працоўнага семестра ў БДУ прайшла 10 кастрычніка ў кінатэатры "Беларусь". Былі ўзнагароджаны найлепшыя камандзіры будатрадаў і студэнты-працаўнікі, якіх віншавала кіраўніцтва БДУ, прадстаўнікі Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ, ветэраны будатрадаўскага руху. Калегі розных пакаленняў падзяліліся ўражаннямі і ўспамінамі, паглядзелі фільм, падрыхтаваны студыяй SVS, пагаварылі пра цяжкасці працы і вясёлыя моманты жыцця.

А 14 кастрычніка ў кінатэатры "Цэнтральны" адбылося гарадское ўрачыстае закрыццё Трэцяга працоўнага семестра. У выніку сельскагаспадарчы атрад "Шчомысліца" зноў прызнаны найлепшым па сталіцы ў сваёй намінацыі, а студэнтка II курса філалагічнага факультэта Ганна Кабанец стала найлепшым байцом сельгасатрада. Студэнт V курса гістарычнага факультэта Яўген Бароўка аб'яўлены найлепшым камандзірам сярод усіх студэнцкіх атрадаў. Пераможцы атрымалі дыпломы і каштоўныя падарункі.

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**

АБ'ЯВЫ

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага мадэліравання і ўпраўлення, англійскага мовазнаўства, гісторыі Расіі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: ядзернай фізікі, вышэйшай матэматыкі, матэматычнай фізікі, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, рускай мовы, гісторыі новага і найноўшага часу, тэарэтычнай і інстытуцыяльнай эканомікі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння ЭВМ, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, раманскіх моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, сучасных замежных моў;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ дынамічнай геалогіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.*

### НДУ "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі дыстанцыйнай фотаметрыі па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка);

Вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі эліёнікі па спецыяльнасці 01.04.07 (фізіка кандэнсаванага стану);

Навуковага супрацоўніка лабараторыі радыёгалаграфіі па спецыяльнасці 01.04.10 (фізіка паўправаднікоў).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7; , аддзел кадраў, тэл. 212-48-43.*

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

дацэнта кафедры сацыяльнай работы.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аддзел кадраў, тэл. 306-00-27.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Прызначэнне чл.-кар. НАН РБ, прафесара Сяргея Абламейкі рэктарам БДУ – **БелТА, БелаПАН, Інтэрфакс; "Советская Белоруссия" (31.10); "Звязда" (01.11); "Народная газета" (01.11); "Настаўніцкая газета" (01.11) і інш.**

Беларуская матэматычная канферэнцыя – **БелТА (02.11); "Народная газета" (04.11).**

Распрацоўка супрацьпухліннага прэпарата "Цісплацэл" НДІ ФХП БДУ – **БелТА (28.10); "Народная газета" (04.11).**

Алея сяброўства ў гонар 87-й гадавіны БДУ – **БелТА (28.10); БелаПАН (29.10); "Вечерний Минск" (30.10).**

Дні Кітая ў БДУ – **БелТА (26.10); БелаПАН (27.10); "Вечерний Минск" (31.10).**

Да юбілею дацэнта кафедры беларускай літаратуры філфака БДУ, дарадчыка рэктара Уладзіміра Навумовіча – **"ЛіМ" (31.10).**

Выстава-кірмаш "Каменная казка" – **БелТА (19.10); БелаПАН (22.10); "Настаўніцкая газета" (01.11); "Обозреватель" (06.11).**

Інтэрв'ю з дырэктарам Нацыянальнага навукова-вучэбнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій БДУ Мікалаем Шумейкам – **"Настаўніцкая газета" (16.10).**

Агляд студэнцкіх газет БДУ – **"Минский курьер" (15.10).**

Наведванне філфака БДУ расійскім паслом Аляксандрам Сурыкавым – **"7 дней" (16.10).**

Рэпетыцыйнае тэсціраванне ў Інстытуце непарыўнай адукацыі БДУ – **БелТА (14.10); tut.by (14.10); naviny.by (14.10); "Советская Белоруссия" (14.10); БелаПАН (14.10); "Вечерний Минск" (16.10); "Чырвоная змена"/"Звязда" (17.10).**

Дзейнасць і планы тэлецэнтра БДУ – **"Звязда" (11.10); "Знамя юности" (17.10).**

Тыдзень маці ў БДУ – **БелТА (12.10); "Рэспубліка" (14.10).**

Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар" – **"Минский курьер" (08.10); tut.by (10.10; 13.10); "ЛіМ" (10.10); БелТА (13.10); "Вечерний Минск" (14.10); "Советская Белоруссия" (15.10); БелаПАН (13.10); "Чырвоная змена"/"Звязда" (17.10); "Настаўніцкая газета" (23.10).**

Да юбілею загадчыцы кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ Тацяны Шамякінай – **"ЛіМ" (10.10).**

Узнагароджанне найлепшых студатрадаў БДУ – **"Минский курьер" (10.10); "Народное слово" (14.10); "Вечерний Минск" (14.10).**

АСОБЫ

# ПРЫЗНАНЫ ЭНТАМОЛАГ

***Нядаўна адзначыў 85-годдзе выбітны навуковец і педагог, найбуйнейшы энтамолаг з сусветным імем, прафесар кафедры заалогіі Ігар ЛАПАЦІН.***

Бліскучыя здольнасці заолага, энтамолага-сістэматыка вызначылі ўплыў прафесара І. К. Лапаціна на фарміраванне ў Беларусі і за яе межамі спецыялістаў у гэтай важнай галіне заалогіі. Ён стварыў школу сістэматыкаў і энтамолагаў, падрыхтаваў больш за 20 кандыдатаў і 6 дактароў біялагічных навук. Ім апублікавана 6 манаграфій і больш чым 250 артыкулаў, з якіх каля 100 – у навуковых замежных выданнях. Прафесар І. К. Лапацін апісаў больш за 700 новых відаў лістаедаў, прыблізна 100 відаў названа ў яго гонар.



На працягу апошніх 38 гадоў пад кіраўніцтвам Ігара Канстанцінавіча ў Беларусі праводзяцца комплексныя эколага-фаўністычныя даследаванні лугавых і лясных экасістэм, жывёльнага свету урбанізаваных і запаведных тэрыторый. Тэматыка яго даследаванняў тычыцца не толькі вывучэння, але і аховы жывёл. Адзін з найбуйнейшых спецыялістаў па фауне насякомых Беларусі і шэрага рэгіёнаў Расіі, І. Лапацін з'яўляецца аўтарам раздзела "Чырвонай кнігі СССР" (1986) і "Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь" (1981, 1993, 2004).

Шырокая эрудыцыя, глыбокія веды, каштоўны лектарскі досвед дазволілі І. Лапаціну ўнесці значны ўклад у стварэнне навучальнай літаратуры па біялагічных дысцыплінах.

На працягу многіх гадоў І. Лапацін з'яўляецца прэзідэнтам Беларускага энтамалагічнага грамадства, членам прэзідыума Рускага (раней – Усесаюзнага) энтамалагічнага грамадства; ганаровым членам Польскага энтамалагічнага і Еўрапейскага калеаптэралагічнага грамадстваў, членам рэдакцыйных саветаў шматлікіх энтамалагічных часопісаў, членам Пастаяннага аргкамітэта міжнародных сімпозіумаў па энтамафаўністыцы Цэнтральнай Еўропы, членам секцыі біялогіі Беларускага фонду фундаментальных даследаванняў.

Заслугі І. Лапаціна ў развіцці навукі і падрыхтоўцы навуковых і педагагічных кадраў адзначаныя медалямі "За доблесную працу" і "Ветэран працы". У 1984 г. ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР, прысуджанай за падручнік "Зоагеаграфія". У 1990 г. яму прысвоена званне Заслужанага работніка народнай адукацыі БССР, а ў 1993 г. ён стаў лаўрэатам прэміі імя А. Сеўчанкі. У 1991 г. у Будапешце І. Лапаціну быў уручаны медаль за выдатныя заслугі ў энтамафаўністыцы Еўропы "Excellenti in Societiae Entomofaunistica". За ўнёсак у развіццё энтамалагічнай навукі і падрыхтоўку навуковых кадраў у 1994 г. І. К. Лапацін абраны ганаровым акадэмікам Пятроўскай акадэміі навук. Ён неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Белдзяржуніверсітэта.

Няхай для Вас, дарагі Ігар Канстанцінавіч, гучаць толькі самыя лепшыя пажаданні, цёплыя словы, якія выказваюць бязмерную ўдзячнасць за нястомную працу, а вучні няхай радуюць сваімі дасягненнямі, дораць павагу і любоў. Моцнага здароўя, доўгіх гадоў, творчых поспехаў і здзяйсненняў!

**Дэканат, супрацоўнікі і студэнты біялагічнага факультэта, вучні, калегі**

СУСТРЭЧЫ

# ГЕАГРАФІЯ Ў ВЕРШАХ

***Бывае, падчас вучобы так хочацца забыцца на залікі і семінары – і душою адпачыць. У студэнтаў геафака такая магчымасць надарылася 13 кастрычніка, калі да іх са сваёй новай кнігай завітаў паэт і галоўны дырэктар замежнага вяшчання Беларускага радыё Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.***



Аматараў паэзіі сярод будучых географаў апынулася досыць многа – некаторым прыхільнікам прыгожага пісьменства нават давялося дзяліць адзін стул на дваіх пры тым, што аўдыторыя для імпрэзы была падабрана прасторная. Цікаўнасць студэнтаў падагравала тое, што вершы гучалі ў выкананні іх калегаў-сяброў, ініцыятыўных хлапчукоў і дзяўчат II курса, якія адгукнуліся на заклік кафедры гісторыі беларускай мовы і Фундаментальнай бібліятэкі БДУ (арганізатараў паэтычнай сустрэчы). Да месца была відэапрэзентацыя, падрыхтаваная супрацоўнікамі аддзела гуманітарна-асветніцкай працы ФБ, – каляровыя слайды з выявамі архітэктурных помнікаў Віцебшчыны суправаджалі расповед пра жыццёвы шлях Навума Гальпяровіча ад нараджэння ў Полацку і першых радыёрэпартажаў у Наваполацку. Удала падабраны відэашэраг аздобіў і прэзентацыю кнігі "Насцеж" – новага зборніка найлепшых вершаў і навел, створаных пісьменнікам у розныя, у тым ліку апошнія, гады.

Сваю зацікаўленасць гледачы-слухачы ў кішэні не хавалі, а дасылалі госцю цыдулкі з пытаннямі. Хацелі ведаць пра ўсё: хто ў творцы бацькі (і пачулі захапляльную гісторыю пра тату-франтавіка, які ў мірныя часы працаваў ахоўнікам на складзе, і пра маму, выкладчыцу гісторыі, якая перажыла блакаду Ленінграда); ці любіць ён вандраваць ("Не так многа, як Тур Хеердал," – засмяяўся ў адказ паэт і распавёў пра полацкага верталётчыка, які праз усю Сібір даслаў суайчынніку мяшок рыбы); на якія мовы перакладалі яго творы (балгарская, румынская, украінская, руская, польская...); удзень ці ўвечар лепш пішуцца вершы ("Пішуцца, калі стукне... Надоечы "стукнула" па дарозе на працу – ледзь дабег запісаць", а запісваць на хаду не схацеў: "Людзі падумаюць: шпіён"); як апублікаваць свае вершы пачаткоўцу ("Цяжка, але сапраўдная паэзія дойдзе да чытача"); як ставіцца да свабоды слова ("Строга. Калі хто напіша, што Гальпяровіч ходзіць у гей-клуб, – гэта свабода слова, але няпраўда. А калі Гальпяровіч напіша, што не ходзіць, – яшчэ хто падумае, а мо сапраўды?.." – аўдыторыя выбухае смехам. – "Слова – рэч адказная, трэба старацца быць сумленным, узважваць свае словы, каб ніхто ад іх не пакутаваў"); ці не думаў з'ехаць за мяжу ("Паглядзець – але вярнуцца"); на якіх музычных інструментах грае, да якога задыякальнага знака належыць, што памятае з дзяцінства, каго чытае... У адказ на такі жывы інтарэс да сваёй асобы творца адказваў з задавальненнем, гумарам і кранальнай шчырасцю, а пасля сам пачытаў са сваёй новай кнігі (са словамі "прывык прэзентацыі адпрацоўваць").

Філасафічныя, задуменныя, творы Навума Гальпяровіча яшчэ і вельмі напеўныя, чым паэт, магчыма, абавязаны любові да народных спеваў. На многія яго вершы кампазітары пісалі музыку (адзін з выканаўцаў – Руслан Аляхно). Таму за сардэчную імпрэзу прысутныя аддзячылі паэту песняй "Ой, сівы конь бяжыць".

У нашай бібліятэцы вы можаце знайсці кнігі Навума Гальпяровіча "Брама", "Струна", "Гэта ўсё для цябе", а калі спадабаецца – завітайце яшчэ і на "Востраў душы", паслухайце душою "Голас і рэха", пахадзіце "Шляхамі і вяртаннямі", падзівіцеся на "Святло ў акне". Там вы знойдзеце і апяванне хараства прыроды, і роздумы пра духоўную культуру чалавека, і развагі над нашай гісторыяй, і шмат іншага. Гэтая няспешная паэзія, якую крытык Людміла Рублеўская трапна параўноўвае з акварэльнымі карцінамі, падорыць чытачу ціхі, светлы вечар.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ЮБІЛЕІ

# ПАКЛІКАНЫ РОДНЫМ СЛОВАМ

## *ДА 65–ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА НАВУМОВІЧА*



***Імя Уладзіміра НАВУМОВІЧА добра вядома шырокай літаратурнай грамадскасці. Пісьменнік, літаратуразнавец, крытык, публіцыст, выкладчык роднай літаратуры, аўтар больш за 260 навуковых прац, папулярызатар гісторыі, літаратуры і культуры Беларусі, шчыры руплівец на ніве сучаснай літаратурнай навукі...***

На светаўспрыманне маладога У. Навумовіча ў значнай ступені паўплывалі бацькі: маці, Марыя Гаўрылаўна, больш за 30 гадоў прапрацавала ў школе і прывіла любоў да роднага слова, павагу да зямлі беларускай, яе гісторыі і людзей; бацька, Аляксандр Раманавіч, у час вайны партызаніў у Налібоцкай пушчы разам з Я. Брылём і У. Калеснікам, што і абумовіла выбар прафесіі настаўніка, якую Уладзімір Аляксандравіч атрымаў на філалагічным факультэце БДУ (1961–1966).

Духоўным бацькам, сапраўдным сябрам для У. Навумовіча стаў прафесар А. Лойка, які яшчэ на другім курсе прыкмеціў таленавітага юнака, вылучыў сярод іншых яго курсавую працу і павёў за сабою па лабірынтах беларускага літаратуразнаўства.

Пасля заканчэння універсітэта У. Навумовіч быў накіраваны на камсамольскую работу, але беларускае літаратуразнаўства па-ранейшаму вабіла багаццем эстэтычнай думкі, прызнанымі аўтарытэтамі ў літаратурнай навуцы, новымі адкрыццямі – і ўчарашні студэнт становіцца аспірантам кафедры беларускай літаратуры і з поспехам абараняе кандыдацкую дысертацыю па тэме "Проза «Маладняка»" (1974). З 1973 г. – выкладчык, а з 1978 г. – дацэнт названай кафедры.

У 1982-1983 гг. У. Навумовіч загадвае кафедрай рускай мовы для замежных студэнтаў. З 1989 г. – загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў, а з 1989 г. па 2000 г. – загадчык кафедры беларусазнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

У 1990 –1994 гг. ён узначальвае Міжнародную школу беларускай мовы, літаратуры і культуры, арганізаваную ім на ўмовах самафінансавання. Слухачамі школы былі вучоныя-славісты, студэнты, перакладчыкі з многіх краін свету. Вынікам працы школы стала ўтварэнне навукова-культурных асяродкаў беларусазнаўства за мяжой – у Італіі, Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі, Егіпце, Японіі і інш.

Навуковы інтарэс У. Навумовіча тычыцца развіцця беларускай літаратуры XX стагоддзя, літаратурных рухаў 20-х гадоў, ідэйна-эстэтычнай эвалюцыі беларускай аповесці, этычна-канцэптуальных асноў усёй беларускай паэзіі і прозы. Вынікам пошукаў сталі манаграфіі "Шляхамі арлянят. Проза «Маладняка»" (1982), "Маральнае аблічча героя ў беларускай мастацкай прозе 60-80-х гг. XX ст." (2000), падручнікі і навучальныя дапаможнікі "Беларусазнаўства" (1998), "Беларуская літаратура" (2000), "Белорусская литература" (2007) і інш.

Вядомы Уладзімір Аляксандравіч і як празаік. Першае апавяданне "Навырast" было змешчана ў 1964 г. у навагрудскай раённай газеце "Новае жыццё", тады ж ён дэбютаваў у рэспубліканскім друку апавяданнем "На скразняку" ў газеце "Чырвоная змена". Ён з'яўляецца аўтарам аповесці пра камсамол "Узаранае поле" (1968), якая ў свой час мела значны грамадскі рэзананс, кнігі прозы "Такое бывае адночы" (1982). У творах пісьменніка паўстае кола вечных праблем, з якіх і выткана жыццё: бацькоўскі дом, сям'я як духоўны асяродак, адносіны да родных і блізкіх, чалавек у кантэксце грамадства наогул.

У. Навумовіч – чалавек вялікага грамадскага патэнцыялу. Ён добра вядомы як папулярызатар беларускай літаратуры і культуры за мяжой: па запрашэнні Лонданскага універсітэта чытаў лекцыі па беларускай літаратуры ў Англіі, працаваў у беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лондане, шмат разоў удзельнічаў у працы моўных семінараў у былой Югаславіі – Бялградзе, Заграбе, Любляне, Марыборы, Задары і інш., усталёўваў навуковыя кантакты з шэрагам ВНУ Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Польшчы, Славеніі; з'яўляецца нязменным лектарам і прапагандыстам таварыства "Веды", арганізатарам і актыўным удзельнікам шматлікіх навуковых і навукова-метадычных канферэнцый, літаратуразнаўчых і краязнаўчых віктарын, а таксама штогадовага свята студэнтаў-філолагаў у Вязынцы.

У спецыяльна распрацаваных для студэнтаў БДУ лекцыйных курсах "Беларусазнаўства" і "Універсітэтазнаўства" ім выкладаюцца праблемы фарміравання універсітэтаў як цывілізацыйных феноменаў у свеце, пачынаючы з Сярэднявечча да нашых часоў, гісторыя і ўмовы стварэння БДУ, а таксама розныя аспекты навучання, што грае важную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў.

У. Навумовіч мае сапраўдны талент прамоўцы, ён здольны звярнуцца да пачуццяў людзей, закранаючы іх душы і сэрцы. Гэтаму спрыяе яго ўменне віртуозна пераходзіць ад жартаўлівай тэмы да сур'ёзнага моманту – як вядома, менавіта жарт і дасціпнае слова дазваляюць найлепш акрэсліць думку.

Сучасная літаратурная навука выходзіць на новыя даляглядыы, шукае новыя падыходы. Літаратуразнаўчая і педагагічная дзейнасць Уладзіміра Навумовіча адпавядае выклікам часу і запатрабаваная маладымі даследчыкамі і чытачамі.

**Таццяна БЕЛЬСКАЯ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

# ТЭЛЕЦЭНТР: АДЛАДЗІЦЬ МЕХАНІЗМ

**Амаль месяц з тэлецэнтра на журфаку БДУ рэгулярна вядзецца вяшчанне. Першую перадачу "Спортлато", знятую на Кальварыйскай, 9, гледачу прапанавалі 12-га кастрычніка, і зараз адсюль у прамы эфір праграма выходзіць два разы на тыдзень. Пра тое, як наладжваецца праца, распавёў намеснік дырэктара тэлецэнтра Сяргей МАЕЎСКІ.**

*– З якімі праблемамі давялося спраўляцца супрацоўнікам тэлецэнтра?*

– На пачатковым этапе запуску любога мудрагелістага тэхнічнага комплексу заўжды бываюць складанасці – дзесьці абсталявання не хапае, ці настройкі няправільна выстаўленыя і г.д. За першы тыдзень эфіраў мы здолелі прывесці цэнтр у стан працаздольнасці. Зараз асаблівых тэхнічных праблем няма.

*– Ці могуць студэнты прысутнічаць у апаратных падчас падрыхтоўкі і непасрэдна эфіру – вучыцца, назіраючы за работай прафесіяналаў?*

– Пакуль што ніхто такога жадання не выказваў. Месяц студэнты займаліся ў студыі гуказапісу, зараз у іх перапынак, затое штодзённа праводзім тры-чатыры аглядныя заняткі па тэлецэнтры для ўсіх студэнтаў-журналістаў: ходзяць, разглядаюць, задаюць пытанні, звычай простыя – што за абсталяванне, як працуе, ці можна прыйсці папрацаваць.


Мара аператара — "кампутар з аб'ектывам"

*– А можна?*

– Канечне. Іншае пытанне, ці будзе гэта мець сэнс зараз. Нас папракаюць, быццам бы мы закрылі тэлецэнтр ад студэнтаў, нікога не пускаем. Я выкладаю кампутарную графіку ў Акадэміі мастацтваў і памятаю, як купілі цудоўнае абсталяванне, студыю, аддалі студэнтам – вучыцеся. І літаральна за паўгода яе развалілі поўнасцю. Улічваючы, што на журфаку абсталяванне куды даражэйшае, тут вырашылі, на шчасце, пайсці іншым шляхам: зрабіць прафесійны тэлецэнтр, арганізаваць прафесійную тэлевытворчасць і затым ужо да яе далучаць студэнтаў. "Спортлато" – гэта першая ластаўка, зараз вядзём перамовы з тэлекампаніямі Саюза Беларусі і Расіі пра запуск вялікага праекта, міжнароднага студэнцкага тэлечасопіса, эфір мяркуецца ў Расіі, Беларусі, шмат дзе. Вось тады будзе сэнс прыходзіць студэнтам: не проста навучыцца на кнопкі націскаць ці ручкі на пультах пакруціць, а пачаць працу над канкрэтным праектам з дапамогай людзей, якія прафесійна гэтым займаюцца. Тады будзе сапраўднае навучанне.

*– Значыць, калі студэнт прыдумае якісь цікавы праект, то можа з ім смела звяртацца да вас?*

– Так, усім студэнтам пра гэта кажу. Ёсць ідэі – прыходзьце, будзем размаўляць


С. Маеўскі дэманструе цэнтральную апаратную

і ажыццяўляць. БДУ выступіў з ініцыятывай арганізацыі адукацыйнага канала на базе тэлецэнтра, адміністрацыя прэзідэнта яе падтрымала і вынесла адпаведнае рашэнне, і да першага верасня мы павінны падрыхтаваць пакет дакументаў. Калі ўсё будзе добра, праз год пойдзем з гэтым каналам у эфір, і там праца студэнтаў зойме важнае месца, будзем актыўна прыцягваць іх да ўсіх тэлевытворчых працэсаў.

*– Наколькі высокага ўзроўню спецыялістаў дазваляе падрыхтаваць тэлецэнтр?*

– На рынку паўсюль, і ў Еўропе, і ў Расіі, агромністы дэфіцыт прафесійных кадраў. Нядаўна праводзілі прэзентацыю тэлецэнтра для супрацоўнікаў рэгіянальных электронных СМІ – у іх такая ж сітуацыя. Не праблема набраць, як часта робяць, людзей з вуліцы, месяц з імі папрацаваць – і зрабіць з іх зорак журналістыкі (хаця такі "спецыяліст" часам ні гаварыць нармальна не ўмее, ні пісаць). Тое самае і з тэхнічнымі кадрамі: чалавек мае гарачае жаданне працаваць на тэлебачанні – і, скажам, філолаг асвойвае прафесію відэаінжынера. Праблема не ў тым, якіх спецыялістаў рыхтуе ВНУ, а ў тым, куды яны ідуць і як працуюць. Методыкі хутка старэюць, абсталяванне ўдасканальваецца. Калі чалавек разам з жаданнем вучыцца мае комплекснае ўяўленне пра тое, што такое тэлебачанне, радыё, інтэрнэт, тады можна пачынаць выхоўваць прафесійнага тэлевізійшчыка. І тэлецэнтр дазваляе займець такое комплекснае ўяўленне: па кожным працоўным месцы можна прайсціся, пабачыць, як што дзейнічае – гэта і ёсць мэта прыгаданых экскурсій.

*– На выпускнікоў журфака многа наракання, не толькі ў нашых СМІ, але і ў расійскіх часцей аддаюць перавагу уладальнікам нежурналісцкіх дыпломаў...*

– Сапраўды, ведаю гэта з уласнага вопыту, і адбываецца гэта таму, што журналісты вывучаюць не тое і не так, як трэба. Часта працуюць з тым, што было дваццаць-трыццаць гадоў таму, а тэхналогіі кожныя два гады поўнасцю мяняюцца, трэба быць больш гнуткім, аператыўным.

*– Тэлецэнтр здольны і павінен быць аператыўным, бо ажыццяўляе камерцыйныя праекты?*

– Так. Але тут узнікаюць праблемы. Любое тэлебачанне патрабуе сурёзнага фінансавання. Калі хочаце зарабіць грошы, напачатку ўкладзіце іх; калі хочаце вельмі шмат зарабіць, давядзецца вельмі шмат укладваць. З-за пэўных абмежаванняў, напрыклад, шосты-сёмы паверхі, адсутнасць дэкарацыйных кішэняў і г.д., мы не можам выконваць па тры-чатыры праекты на тыдзень. Кампенсаваць "прастой" цэнтра можна, калі студый будзе некалькі. У будынку ёсць вялікія аўдыторыі – з іх можна зрабіць стометровыя павільёны, прыкладам, адзін выкарыстоўваць для стварэння праграм навінаў, скажам, запускаць універсітэцкія навіны, другі для заказных праектаў, калі ласка – вядзіце адукацыйны працэс на цалкам прафесійнай аснове. Актавая зала таксама амаль гатовая студыя. Можна зрабіць разборную канструкцыю, якая дазволіць тут і здымкі праводзіць, і захаваць за залай функцыі грамадскага месца, памяшканне не будзе дарэмна прастойваць. У нас заказчыкаў чэргі стаяць, два тыдні таму сюды "НТВ-Кіно" прыязджала, ім усё вельмі спадабалася, але ўціснуцца ў той сітуацыі, у якой мы зараз знаходзімся, сюды нельга.

*– Дырэктар Інстытута журналістыкі ў курсе гэтай праблемы?*

– Сітуацыя тут складаная: калі пачнём прасіць памяшканні, тэлецэнтр зноў папікнуць, што ён забірае у студэнтаў памяшканні. Мы не хочам, каб нас лічылі ворагамі. Але і прастойваць, калі добрыя прапановы самі стукаюцца ў дзверы, не хочам, гэта нікому не выгадна. Той жа Угольнікаў хоча аднавіць праект "Добры вечар, Расія", памяшканне ім патрэбнае не меншае, чым наша студыя, у якой зараз стацыянарна зманціраваны дэкарацыі для "Спортлато". Калі універсітэт пойдзе на тое, каб актаўную залу перарабіць у студыю, дык можам займець цыклавую праграму, 52 хвіліны, на расійсім тэлебачанні, з велізарнай аўдыторыяй, да нас будуць усе маскоўскія зоркі прыязджаць. Для універсітэта абсалютна выгадны праект, і па грошах, і па іміджавых дывідэндах, а яшчэ турызму паспрыяе... Тыя ж студэнты змогуць прыйсці на гэтае шоу ў якасці гледачоў – пабачыць, як усё працуе, і мы іх будзем з радасцю браць у абарот. Гэта вельмі свежая прапанова, якую яшчэ амаль не абмяркоўвалі з кіраўніцтвам.


Працоўнае месца гукарэжысёра

*– Чым будзе адметны канал, які вы па замове універсітэта плануеце арганізаваць на базе тэлецэнтра?*

– Тэхніка з кожным годам ускладняецца і робіцца больш таннай. Калі раней, каб запачаткаваць тэлеканал, патрэбныя былі мільёны, дык цяпер лік ідзе на дзесяткі тысяч. Колькасць каналаў пачынае лавінападобна расці, адбываецца іх "кланаванне", калі недахоп кантэнту прыводзіць да таго, што, скажам, "Брыльянтавую руку" паказваюць з інтэрвалам у некалькі дзён на ўсіх каналах. Вынік: па кабельным тэлебачанні маем 70-80 каналаў, а глядзець няма чаго. Таму будучыня тэлебачання – гэта не столькі новыя тэхналогіі ці зліццё ўсіх электронных масмедыя ў адзіны інфармацыйны асяродак, колькі вытворчасць адметнага кантэнту.

*– Ці будзе мець значэнне месцазнаходжанне канала, ягоная блізкасць да творчай моладзі – студэнтаў журфака?*

– Канечне. Зараз гэтага не відаць, бо пакуль што канал не пачаў працаваць. Тэлеканал – гэта своеасаблівая надбудова над тэхнічнай часткай. Мы зараз запусцілі механізм, ён пачне стабільна дзейнічаць – тады і зоймемся "надбудовай", тады і будуць прыцягвацца студэнты.

### Структура

Тэлецэнтр падзяляецца на тры функцыянальныя зоны. Першая – гэта апаратна-студыйны комплекс і тэлевізійны павільён, тут зараз ажыццяўляецца запуск у прамы эфір перадачы "Спортлато". Другая – студыя гуказапісу, дзе праходзяць заняткі ў будучых журналістаў: першакурснікі прывучаюцца чуць уласны голас у запісе. Трэцяя зона – гатовая да выкарыстання і пакуль законсерваваная радыёстудыя. Дзверы цэнтра заўжды адкрытыя для тых, хто мае канструктыўныя прапановы.

### Камерцыя

Адна гадзіна працы тэлестудыі (калі запаліць усе лямпачкі павільёна, задзейнічаць камеры ды іншае «жалеза») каштуе каля $300, таму карыстацца ёю адно для вучэбных мэтаў нерацыянальна. Тым больш што прэзідэнт краіны, наведаўшы новы корпус БДУ на Кальварыйскай, асабліва падкрэсліў, што праца тэлецэнтра павінна стаць прыбытковай: найперш трэба вярнуць грошы, затрачаныя дзяржавай на пакупку найноўшага абсталявання, затым — небюджэтны фонд БДУ папаўняць.

Таму ў цэнтры сфарміраваны пакет заказаў на год наперад. Напрыклад, цяпер у адным з вучэбных класаў завяршаецца мантаж стужкі расійскага рэжысёра Дзмітрыя Астрахана, у студыі гуказапісу працуе струнны ансамбль і кампазітар Віктар Капыцька, якія ствараюць музыку да мультфільма — сумеснага праекта расійскага канала «Мир» і «Мосфильма», а ў фотапавільёне была арганізавана фотасесія ўдзельнікаў дзіцячага «Еўрабачання».


Павільён тэлецэнтра – у дэкарацыях "Спортлато"

Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# ІНТЭРКАМПАНІЯ

***Зямлю засяляюць людзі розных нацыянальнасцяў і рэлігій. Людзі з адрознымі колерамі скуры і разрэзам вачэй... Так здараецца, што ўсе яны вельмі часта не здольны зразумець адзін аднаго.***



У Белдзяржуніверсітэце сёння навучаюцца каля тысячы замежных студэнтаў з 30 краін свету. Напрыканцы кастрычніка БДУ споўнілася 87 гадоў, і менавіта да гэтай урачыстасці групай ініцыятыўных студэнтаў – Моладзевай лігай нацый БДУ – была падрыхтавана акцыя "Дзень сяброўства". У арганізацыі мерапрыемства дапамагалі БРСМ і Студсаюз БДУ.

Галоўнай "разынкай" акцыі стала пасадка Алеі сяброўства, пра што ўдзельнікі МЛН марылі з дня заснавання і з нецярпеннем чакалі толькі зручнай нагоды. Арганізацыя ўжо ажыццявіла шэраг запамінальных інтэрнацыянальных дзей, хоць яе гісторыя адносна кароткая. Іх сутнасць у тым, каб, нават знаходзячыся ўдалечыні ад свайго дома, ад сваіх родных і блізкіх, замежныя студэнты як мага менш па гэтым сумавалі. Бо што можа перашкодзіць плённай вучобе больш, чым нуда па Радзіме!

На Кальварыйскай, 9 яшчэ ніколі не чулі столькі моў. Беларусь, Расія, Украіна, Азербайджан, Туркменістан, Арменія, Польшча, Эстонія, Літва, Ізраіль, Сербія, Германія, Францыя, Турцыя, КНР, В'етнам, Паўднёвая Карэя, Шры-Ланка, Нігерыя... Прадстаўнікі шматлікіх краін свету, студэнты БДУ сабраліся 30 кастрычніка ля будынка Інстытута журналістыкі і ФФСН з адной толькі мэтай – пасадзіць Алею сяброўства народаў.

На запрашэнне да ўдзелу з задавальненнем адгукнуліся пасол Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Ву Суан Нінь і Часовы Паверраны ў справах Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Цзян Сяоян. Яны прыкмецілі, што "падобныя мерапрыемствы – гэта ўзвядзенне мастоў паміж народамі".

У канцэртнай частцы праграмы "Дня сяброўства" замежныя навучэнцы паказалі творчыя здольнасці: кітайскія студэнткі прадэманстравалі ўсю загадкавасць сваёй культуры, увасобіўшы яе ў дзівосным танцы, юнакі з Кітая, Беларусі і Азербайджана прачыталі сумесны верш, а магістрант філалагічнага факультэта Чжан Жаньсянь выканаў песню – усё, натуральна, пра сяброўства. Менавіта яно дапамагае зразумець чужую для цябе мову.

Акцыя "Алея сяброўства" не абмяжоўваецца БДУ – гэта рэальны крок на шляху збліжэння народаў, што так патрэбнае людзям ва ўсім свеце. Народы, нацыянальнасці і дзяржавы – зыбкія пяскі. Спадзяёмся, што карані пасаджаных дрэваў умацуюць пад намі глебу!

**Арцём СТАРАВОЙТАЎ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ГЛЯДЗЕЦЬ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ...

**У дзяцінстве мы ўсе марым стаць дарослымі, а я мару стаць дзіцём! Ведаеце чаму? Таму, што дзіця бачыць свет іншымі вачыма!**

Студэнты БДУ 22 кастрычніка вярнуліся ў дзяцінства, у рамках ужо традыцыйнай акцыі Каардынацыйнага савета "Годнае дзяцінства". У гэты раз нашы хлопцы і дзяўчаты адправіліся ў школу-інтэрнат для дзяцей з неспецыфічнымі захворваннямі органаў дыхання ў пасёлак Чырвоная Слабада Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

Першым прыпынкам стаў горад Салігорск. Старшыня раённага савета дэпутатаў Лідзія Клішэвіч расказала гісторыю горада і арганізавала сустрэчу з навучэнцамі агульнаадукацыйнай школы № 9 з мастацкім ухілам.

Другім прыпынкам стала вытворчае аб'яднанне "Беларуськалій". Студэнты спусціліся ў шахту на глыбіню 420 метраў. Мора ўражанняў ад наведвання рудніка застанецца ў памяці надоўга.

Але самым галоўным пунктам прызначэння была, безумоўна, ужо згаданая школа-інтэрнат. Установа размясцілася ў выдатным месцы: елкі, свежае паветра – усё для здароўя дзяцей з захворваннямі органаў дыхання. Студэнты з хваляваннем адчынялі дзверы школы: што ж чакае нас там? Як сустрэнуць дзеці? Але хваляванне адразу ж развеялі ветлівыя ўсмешкі малых. З першых хвілін знаходжання ў школе студэнты былі акружаныя ўвагай, дзеці ўсяляк імкнуліся дапамагчы, паўдзельнічаць у падрыхтоўцы запланаваных для розных узроставых груп гульняў.

З 3-5 класамі была праведзена гульня "Падарожжа па планетах". Дзеткі пабывалі на Марсе, Юпітэры, Сатурне, Меркурыі. На кожнай з планет трэба было выканаць заданне: намаляваць, зрабіць калаж, праспяваць. Дзеці былі бясконца рады. Пасля касмічнай адысеі ўсе шчасліва вярнуліся на Зямлю і атрымалі салодкія падарункі.

6-8 класы пагулялі ў "Марскі бой". Бітва была няпростай. За кожны збіты карабель каманда выконвала вясёлыя заданні. Смех не спыняўся ні на хвіліну.

Старэйшым дзецям расказалі пра спецыяльнасці, якім навучаюць у Белдзяржуніверсітэце, і пра правілы паступлення. Бо хутка ім трэба будзе выбіраць далейшы шлях у жыцці, які, магчыма, будзе звязаны менавіта з БДУ.

У канцы праграмы ў актавай зале студэнты паказалі канцэрт. Дзеці пераканаліся, што ва ўніверсітэце можна не толькі вучыцца, але і займацца творчасцю, дарыць людзям дабро сваімі танцамі і песнямі. Напрыканцы школьнай бібліятэцы быў падораны набор энцыклапедый.

Дзень у Салігорску надоўга застанецца ў памяці студэнтаў, але яшчэ больш – у памяці мілых школьнікаў-інтэрнатаўцаў. Вочы іх былі напоўненыя шчасцем і радасцю. Дзеці вераць у цуды, яны заўсёды чакаюць лепшага. Дык давайце глядзець на свет вачыма дзяцей...

**Юлія САНЬКО**

НАШЫ ГОСЦІ

# ДНІ КІТАЯ

***Дні Кітая ў Белдзяржуніверсітэце прайшлі з 27 па 31 кастрычніка пад патранажам Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.***

Урачыстае адкрыццё Дзён адбылося 29 кастрычніка ў будынку юрыдычнага факультэта з удзелам кіраўніцтва БДУ, прадстаўнікоў Дзяржканцылярыі па распаўсюджванні кітайскай мовы і культуры, а таксама Пекінскага універсітэта мовы і культуры і пасольства КНР у Беларусі. Рэтраспляцыя мерапрыемства вялася ў холе юрфака і ў факультэцкай бібліятэцы, дзе за ёй сачылі студэнты і выкладчыкі. На цырымоніі школа алімпійскага рэзерву №7 прадэманстравала сваё валоданне кунг-фу, прагучалі песні на кітайскай мове ў выкананні прафесійнага ансамбля. Акрамя таго ўсе прысутныя пазнаёміліся са знакамітымі ўсходнімі гарбатнымі традыцыямі і маглі пакаштаваць прыгатаваны тут жа напой пад акампанемент народнага кітайскага інструмента піпа.

На працягу тыдня ў будынку юрфака працавалі выстава кітайскага жывапісу, выдадзеных у Кітаі унікальных кніг па культуры і мастацтве гэтай краіны, а таксама падручнікаў. Сваю навучальную літаратуру, часопісы і кнігі, DVD-дыскі па культуры Кітая, метадычы выкладання кітайскай мовы прадставіў і Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.



Упершыню быў арганізаваны вернісаж кітайскага жывапісу, а яшчэ ў праграме Дзён было знаёмства з мастацтвам каліграфіі, кітайскай кухні і ушу. У межах мерапрыемства прайшло пасяджэнне аб'яднанага вучонага савета РІК імя Канфуцыя і Пекінскага універсітэта мовы і культуры.

**Анастасія ШМІГЕЛЬСКАЯ**

ШКОЛА АКТЫВУ

# НОВАЯ ПЛЕЯДА "БРЫГАНЦІНЫ"

***Таленавітыя! Занадта таленавітыя! Толькі так можна ахарактарызаваць старастаў-першакурснікаў БДУ. Гледзячы на ўвесь гэты паказ вачыма ўжо не першакурсніцы, а члена аргкамітэта – зайздросціла. Глядзела і ўсміхалася. Захаплялася!***



*Быць старастай – не толькі адказна, але і весела*

Шоу старастаў можна было ўбачыць у спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна" з 7 па 9 кастрычніка.

Падрыхтоўка да выязнога семінара "Ты – стараста!" пачалася задоўга да яго. Прадстаўнікі ўсіх факультэтаў былі запрошаны на збор, дзе іх падзялілі на каманды (хімфак з юрфакам, журналісты з філасофамі). Колькасць удзельнікаў у групе вагалася ад 18 да 25.

Старасты атрымалі заданне, даведаліся, да якіх конкурсаў трэба рыхтавацца, і пазнаёміліся з удзельнікамі "суполкі". І нараджалася творчасць...

*Дзень першы: усё толькі пачынаецца!*

Не паспелі старасты разабраць чамаданы, а трэба ўжо прадстаўляць каманду. Творча, гарэзна, весела! Тут вам і "Акушэры" – радыёфізікі з біёлагамі, і "Права на выбух" – біёлагі плюс юрысты, і "Бэ" – ДзІКСТ, гістфак, ІБМТ.

Хто спяваў песні, хто танчыў, хто страляў жартамі. У выніку перамогу ў гэтым конкурсе атрымалі эканамісты і філолагі. Іх нумар быў настолькі зладжаны і выразны, што сумненняў не заставалася – вось яна, сапраўдная каманда!

Далей трэнінгі на згуртаванне (team-building). Адны з газеты рабілі будынкі, другія пэцкалі рукі пластылінам, трэція мучыліся з тэнісным шарыкам і ніткамі... І, прайшоўшы ўсе нялёгкія выпрабаванні, камандны дух стаў сапраўды моцным, бо далей старастаў-першакурснікаў чакаў сапраўдны спартыўны турнір "Старфон".

Цёмна. Халодна. Толькі слабае святло ліхтарыкаў, якія бегаюць па лагеры, нагадваў пра існае тут жыццё. Гэта "нашы" – шукалі альтанку з чарговым заданнем. Экстрым? Яшчэ той! Але ўсім спадабалася!

*Дзень другі – адраджэнне.*

Каб нашы старасты не расслабляліся – ранішняя зарадка пад актыўную музыку. Прачнуліся? Зараз даведаемся, як стваруюцца праекты. Куратары груп расказалі і паказалі сваім падапечным усю сістэму зацікавання ідэі, якая ўзнікла на паперы.

Першакурснікі хацелі наведваць дзіцячыя дамы, ладзіць фестывалі для замежных студэнтаў БДУ, будаваць спартыўны комплекс "Гай", а таксама арганізаваць праграму "Выпадковыя людзі", дзе кожны студэнт мог стаць шчаслівчыкам.

Стварылі праект? Зараз паспрабуйце яго абараніць. А тут не ўсё так проста. Журы задае каверзныя пытанні "для чаго?", "навіэна?", "такі праект ужо існуе..." – вось тут і пакажы сябе! Да канца адстойвай свой праект і не бойся нічога.

Пасля абеду – час на падрыхтоўку творчага вечара "Тройка. Сямёрка. Туз".

Дадзена: тры сцэнкі, сем прыпевак, адзін "казырны" нумар. Знайсці: як выйграць? Рашэнне: паказаць усё, на што вы здольныя і нядольныя!

Вечар прайшоў "на ўра"! Усе смяяліся, апладзіравалі, разам спявалі песні – адна дружная і вялікая сям'я БДУ!

Ну, і на дэсерт – дыскатэка "Суперлато – 87" у стылі рэтра. Абавязкова: дрэс-код, добры настрой і гатовы танцавальны нумар. Падчас мерапрыемства з'явілася адчуванне, што я сяджу дома на канапе і гляджу вельмі класны фільм. Такіх танцаў, майстэрства, напалу "Брыганціна" не бачыла даўно! Пасля аргкамітэт зрабіў сюрпрыз першакурснікам і паказаў свае танцавальныя здольнасці.

*Дзень трэці – застаўца...*

Дзень апошні таксама пачаўся з зарадкі. У здаровым целе – здаровы дух! Потым – сустрэча з кіраўніцтвам універсітэта і напрыканцы традыцыйны фатаздымак на памяць. Усе разам. Мы БДУ!

**Анастасія ПЯТРОВІЧ**

## УСМІХНЁМСЯ

*Эрнэст Рэзерфорд* быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй па хіміі за стварэнне тэорыі радыеактыўнага распаду атамаў. На пытанне журналіста: як яму, фізіку, удалося атрымаць прэмію па хіміі, прафесар адказаў:

– Мне прыходзілася мець справу з разнастайнымі ператварэннямі вельмі рознай працягласці, але найхутчэйшае з усіх, мне вядомых, – гэта маё ўласнае ператварэнне з фізіка ў хіміка: яно адбылося ў імгненне вока.

***

Аўтар трэцяга пачатку тэрмадынамікі *Вальтар Нернст* у вольны час разводзіў карпаў. Аднойчы хтосьці глыбокадумна заначыў:

– Дзіўны выбар. Курэй разводзіць і то цікавей.

Нернст спакойна адказаў:

– Я разводжу такіх жывёлін, якія знаходзяцца ў тэрмадынамічнай раўнавазе з навакольным асяроддзем. Разводзіць цеплакроўных – гэта значыць абагравы на свае грошы сусветную прастору.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

12 лістапада 2008 года
Падпісана да друку 13.11.2008 г.
Зак.1247. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, просп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by